... Назавтра было воскресенье. Из-за двери матери и дочери не доносилось ни звука. Что там происходило? Наконец на кухне появилась Нина Игнатьевна, торопливо принялась готовить завтрак, отнесла на подносе тарелки к себе...

Илона «выползла» где-то в полдень, когда Нина Игнатьевна убежала на свою вторую работу. Мы обе сделали вид, что вчерашнего дня просто не было. Молчали. Потом Илона как бы нехотя вытащила из ящика кухонного стола лоток с вилками и ложками и принялась чистить их с помощью какого-то новомодного средства. Она ловко протирала их тряпочкой, умело полировала полотенчиком каждый зубик на вилке, каждый завиток на ручке, и все поглядывала на меня: вижу или нет? Оценю или нет.

Светлана УСТИНОВИЧ.



Больная женщина – это проблема всего общества, проблема будущего страны. Женщина — это здоровье нации... Статистика последних лет неутешительна. Онкозаболевания занимают первое место в мире среди причин смертности населения; а у онкобольных женщин на первом месте — рак молочной железы. Число таких заболеваний в Беларуси постоянно растет: на 3-5% в год. В НИИ онкологии и медицинской радиологии Министерства здравоохранения РБ ежегодно проходят курс лечения более 500 больных с опухолями молочной железы, из них более 300 — со злокачественными опухолями. Именно поэтому мы решили поговорить с главным маммологом Минздрава Республики Беларусь, руководителем Республиканского маммологического центра, руководителем отделения опухолей молочной железы НИИ ОМР, членом-корреспондентом Академии медицинских наук Беларуси, профессором Леонидом Алексеевичем ПУТЫРСКИМ.

"Я ХОЧУ, ЧТОБЫ НАШИ ЖЕНЩИНЫ БЫЛИ ЗДОРОВЫ И КРАСИВЫ"

— Здоровье в наше время решает многое, если не все, в жизни человека. Чем можно объяснить увеличение роста онкологических заболеваний, в частности опухолей молочной железы? Каковы причины, влияющие на заболеваемость?

— Сейчас принято подводить итоги века. Так вот, благодаря успехам медицины многие болезни отошли на второй план, например, инфекционные. В то же время на первую позицию вышли сердечно-сосудистые и онкологические заболевания. Причем количество их постоянно растет. Сказывается слабая информированность населения: мало у нас знают о современных возможностях профилактики заболеваний, ранней диагностике и возможностях излечения от рака...

Итак, вы спрашиваете, что повышает риск возникновения опухолей молочной железы?

В первую очередь, — возрастные заболевания женщин от 40 до 60 лет. Вторая причина — наследственность. В 5 процентах случаев рак молочной железы передается из поколения в поколение; передается, кстати, и предрасположенность к нему. Нередко опухоль молочной железы появляется после травмы, поэтому надо оберегать грудь от ударов. Если же на месте травмы осталось уплотнение, нужно срочно обратиться к онкологу, а не терять время и не заниматься самолечением. Большое значение имеют и психологические травмы, то есть ежедневные перегрузки нервной системы, стрессы, способные резко ускорить рост опухоли в груди, если она появилась. Нельзя исключать, что и сами стрессы могут вызвать поломки в организме и привести, в конце концов, к развитию опухоли. (Кстати, если вам предстоит неприятный разговор — настройтесь соответственно, примите успокоительные средства, — это поможет уменьшить волнение, приводящее к стрессовым ситуациям).



Наши женщины, увы, мало рожают, мало кормят грудью и, наоборот, делают много абортов. Должна быть нормальная половая жизнь. Давно замечено, что рак молочной железы гораздо чаще появляется у монахинь: риск появления этой опухоли у них в 5 раз выше, чем у замужних женщин.

Также имеет значение и состояние экологии. Причем многое зависит и от "погоды в доме": от наличия электробытовой и прочей техники в вашей квартире. Молодежь, работающая с компьютерами, с яркими источниками света (это относится, например, к чертежницам), подвергает себя немалому риску. Еще больше рискует девушка, которая курит.

— Зависит ли онкологическая заболеваемость от питания?

— Да. На основании имеющихся у нас сведений мы, онкологи, настаиваем на снижении потребления жиров (особенно животного происхождения). Ешьте как можно больше свежих фруктов и овощей. Необходимо следить, чтобы в организм не попадали нитраты. Хочется посоветовать: выращивайте овощи и фрукты сами на своем приусадебном или дачном участке. Так вы будете знать, что у вас на столе. Вообще ешьте больше черной смородины, грейпфрутов, апельсинов, клубники, черники. Хлеб старайтесь употреблять черный, а белый – как можно реже. Полезны овсяные хлопья, разнообразные крупы, продукты из кукурузной муки и пшеницы в самом разнообразном виде. Если вы обеспечили себя на зиму картофелем, то все в порядке. Блюда из картофеля можно употреблять часто и в самом разнообразном виде, но полезнее всего печеный неочищенный картофель. Не забывайте о гречневой крупе, нешлифованном рисе. Кушайте побольше чеснока и лука. Из молочных продуктов рекомендую творог, нежирные сорта молока, кефир. Используйте растительные масла. Мяса пусть будет поменьше, лучше ешьте любую рыбу: речную, морскую. И, конечно, не злоупотребляйте алкогольными напитками.

И еще один совет: не употребляйте порченые продукты, они очень вредны. Даже если вам придется выбросить все содержимое холодильника – выбрасывайте!

Недостаток витаминов (особенно витаминов А, Е, С) в нашем питании также влияет на появление онкозаболеваний. (Согласно исследованиям ученых Национальной академии наук, у 70 процентов беларусских детей — гиповитаминоз: не хватает витамина С.) Я рекомендую всем прием витаминов, которые производит фирма "Вибурнум": это "АОК" (антиоксидантный комплекс), "АОК+селен". Для молодых женщин, которые хотят забеременеть и родить здорового ребенка, разработан поливитаминный комплекс "Гравитус", есть также "Витус-М", "Витус-йод". Мы рекомендуем их и людям с нарушенной функцией щитовидной железы, ибо больная щитовидка – один из факторов возникновения опухолей.

Продолжение на стр. 10.

ПАСАГ – маёмасць і грошы, што даюць бацькі або родзічы маладой, калі яна выходзіць замуж. Пасаг – пажыццёвая ўласнасць нявесткі.

Окончание. Начало на стр. 9.

— *Отдельного разговора заслуживает, видимо, витамин Д...*

— Конечно! Этот очень важный витамин образуется в организме человека с участием солнца. Но в Беларуси такая радиологическая ситуация, при которой не рекомендовано загорать. Тем не менее мы говорим: почаще гуляйте на свежем воздухе, особенно вблизи моря, если, конечно, позволяют средства. Гуляйте в тени деревьев, прикрывайте голову широкополой шляпой...

— *Разумеется, чернобыльская авария повлияла на увеличение количества онкозаболеваний. Однако в Японии, например, всплеск их произошел через 10 лет. А у нас?*

— Вы правы насчет Японии: там большинство людей, которым в момент взрыва атомных бомб было меньше 19 лет, почувствовало недомогания только спустя десятилетия... В Беларуси темпы роста больных раком молочной железы в Гомельской области с 1996 года были больше, чем в других областях. Но сегодня наша статистика не отражает истинную картину заболеваний. Многие люди, облученные Чернобылем, переехали в другие районы республики и тем самым повысили процент заболеваемости в тех местах, где сейчас живут.



— *Леонид Алексеевич, вы рассказали о причинах возникновения рака молочной железы. Теперь каждая женщина должна постараться сделать так, чтоб их было меньше.*

— Женщины должны один раз в месяц осматривать свою грудь. Как смотреть и на что обращать внимание – это отдельный разговор. Один раз в год необходимо ходить к специалисту – гинекологу, онкологу, маммологу.

— *Многие не знают, чем занимается маммолог.*

— Это врач, специализирующийся на заболеваниях молочной железы. Если женщина нашла у себя в груди уплотнение, она, не откладывая, должна идти к специалисту. Пусть лучше тревога окажется ложной. Главное – не запустить ситуацию. У нас на I стадии заболевания выявляется только 13—15 процентов больных, а в США — 50—55 процентов.

— *На ваш взгляд, приемлемы ли нетрадиционные методы при лечении онкозаболеваний? Можно ли обращаться, например, к экстрасенсам, народным целителям?*

— Никаких экстрасенсов и колдунов! Только специальная медицина! Иначе можно потерять не только деньги (что деньги!). Можно потерять жизнь.

Дополнением традиционной медицины, да и то по рекомендации врача, служит физиотерапия и гомеопатические средства. Можно рекомендовать некоторые пищевые добавки. Я подчеркиваю — некоторые, но не все подряд.

— *Наши читательницы знают, что два месяца назад в городском поселке Боровляны, что под Минском, открылось новое здание Республиканского маммологического центра. Расскажите, пожалуйста, о самом Центре, его создании, проблемах, оборудовании...*

— Решение о создании маммологического центра было принято в 1996 году — в связи с выраженной тенденцией роста злокачественных новообразований, в частности рака молочной железы. Свою работу можем проанализировать цифрами: с 1994 по 1998 год запущенность заболеваний раком молочной железы в Беларуси уменьшилась на 8,7 %, а по Минской области – на 19 %.

Я с гордостью могу сказать, что коллектив врачей у нас прекрасный. Наши специалисты на сегодняшний день занимаются не только клинической, но и профилактической работой. Чтобы понять ее суть, приведу пример.

Если мы рано обнаружили заболевание, когда опухоль не превышает 2 сантиметра и не вышла за пределы молочной железы, если провели лечение, то в течение пяти лет нет возврата болезни, а чаще всего рецидива нет и потом у 90—95% женщин (по мировым стандартам). Выживаемость при II стадии заболевания, когда опухоль выросла до 5 сантиметров, вышла за пределы молочной железы и есть метастазы в лимфоузлах, падает – до 70—85%. III стадия заболеваемости – только около 50% больных женщин переживают пятилетний рубеж. А если опухоль дает отдаленные метастазы — выживают всего лишь 15—20 %.

Профилактическая работа наших врачей (а это проведение лекций, показ видеофильмов, практические занятия с целью научить правильно исследовать свою грудь и многое другое) помогает ранней диагностике новообразований. Чем раньше обратится женщина к нам, тем легче ее лечить. И дешевле! Один курс химиотерапии обходится государству в 1000 долларов, а всего таких курсов — шесть.

В нашем Центре новое клиническое отделение рассчитано на 80 коек — для госпитализации. Что касается оборудования, то на открытии нового корпуса Центра, которое состоялось 28 октября прошлого года, министр здравоохранения пообещал нам самую современную технику. Сейчас ее недостаточно. И все же Институт онкологии обеспечивается лучше, чем другие лечебные учреждения. Женщинам не приходится покупать одноразовые шприцы. У нас хорошее питание.

— *Вы принимаете женщин и из столицы, и из глубинки, так?*

— Конечно, человек вправе выбрать то место, где он хочет лечиться. Мы никому не отказываем. Но, хочу сказать, что в диспансерах по месту жительства работают хорошие врачи, поэтому необязательно ехать к нам. Разве только есть необходимость в консультации.

— *Контактируете ли вы с зарубежными маммологическими центрами?*

— Только что два наших специалиста вернулись из Франции, где находились на стажировке. Я сам стажировался во Франции, Германии и США. Новые методы диагностики и лечения рака молочной железы, используемые за рубежом, применяются и у нас. Исключение составляют самые последние лекарственные препараты, которые в Беларуси еще не зарегистрированы или из-за своей дороговизны не закупаются.

— *В последнее время много разговоров ведется о платном лечении...*

— В нашем Центре платное лечение пока не практикуется.

— *Ваши планы как руководителя Центра.*

— Очень много творческих задумок: новые методы лечения, новые диссертации на уровне мировых стандартов, контакты с зарубежными коллегами... Стремимся разработать такие операции, которые сохранят женщинам грудь. Ищем возможности наиболее полной реабилитации больных после операции.

Я хочу, чтобы вы и ваши читательницы знали: 20 тысяч женщин Беларуси, которые были прооперированы по поводу рака молочной железы, сегодня живут полноценной жизнью.

Свой Центр мы хотим видеть красивым, уютным — как за рубежом. У нас много спонсоров, людей, которые нам помогают, потому что мы в свое время помогли им. Академия художеств пообещала украсить новое здание картинами, скульптурами, чтобы, глядя на красоту вокруг себя, люди могли отвлечься от своих мыслей о болезнях.

В заключение разговора хочу сказать всем женщинам: берегите себя. Желаю вам красоты и здоровья!

— *Спасибо!*

От читательниц нашей газеты на приеме у маммолога была Светлана СЕЛЕТОВА.

ПАСАГ

Нашы продкі заўсёды лічылі: нарадзілася дачка – купляй куфар ды пачынай збіраць туды пасаг...

Сёння ў нас нарадзілася новая рубрыка. Ёй таксама спатрэбіцца куфар, ці пакуль што звычайная папка з завязкамі, куды мы з дапамогай чытачоў маем намер збіраць пасаг для дочак, унучак, ды ўсіх, каму неабходна добрая парада ці сяброўская дапамога, цікавы рэцэпт ці проста жыццёвая падказка. Усё гэта – пасаг, хіба не так? Добры дадатак да таго, што набываюць для нявесты традыцыйна.

Ну, дык з чаго пачнём?

Спачатку іду да сваёй уласнай бабулі. Ёй зараз амаль 80. Пытаюся, чаго б яна пажадала ўнучкам і праўнучкам на пасаг. Мо і сакрэт ім які падаруе?

— **Хочацца, каб маладыя як мага больш у шчасці жылі. Але ж гэта ад іх саміх і залежыць: не трэба імкнуцца перайначыць адно другога на свой лад. Разумей, што твой муж – не твая здабыча ці ўласнасць: як ты да яго будзеш ставіцца, так і ён да цябе...**

— Надта ж просты сакрэт твой, бабуля!

— Што нам падаецца простым – часам, вельмі складана...

Ну, бабулі, мабыць, відней! – разважаю, ідучы на работу. А каля пад'езда наш дворнік цётка Сцяпаніха вышла снег адграбаць.

— Пра пасаг пытаешся? – крышку здзівілася. – Ах, у газету! Ну, дык вось: **лепшы пасаг для маладзіцы ў наш час – здароўе. Пра яго клапаціцца трэба перш за ўсё.** Дзяўчаткі з нашага дома ў басейн бягуць. Ая, як з маленства бацькі прывучылі: раніцай – пад халодны душ. Надвор'я ані якага не баюся.

— Няўжо ніколі не прастуджваешся, цётка?

— Чаму ж не? Калі-нікалі інфекцыя прыстае – дзень жа на людзях, ды і па ўзросту пенсіянерка. Толькі я добры сродак знаю, як прастуду хутчэй адвесці.

— Дык пакінь яго ў нашым куфэрку.

— Калі ласка, запісвай. **Трэба змяшаць крыху воцату з алеем, намачыць шарсцяную тканіну (можна – старую хустку) ды абвязаць яе вакол сябе на ноч. На спіну можна прыкласці кампрэс з цёртага хрэну. А папярэдне ногі папарыць у вадзе з гарчыцай...**

Дзякую цётцы – і хуценька на прыпынак. Даганяю знаёмую з суседняга дома. Нам з ёй ехаць у адзін бок. Па дарозе і ёй расказваю, што збіраю парады нявестам.

— Ой, а ў мяне ж два сыны! – кажа знаёмая. – Старэйшы жанаты і я не нарадуюся на нявестку. Разумная, спрытная, надта здатная ежу гатаваць. Я ўсё прыглядалася, што ж яна сыну з сабой на работу дае. Ведаеце – бутэрброды! Ды толькі зусім незвычайныя. Магу і рэцэпты пераказаць, можа каму спадабаюцца.

Тым часам тралейбус спыніўся на патрэбным мне прыпынку. Выходжу і бачу Верачку, сакратарку нашу. Вера – жанчына амаль без узросту. Не то 25, не то хутка 40.

— Выдатна выглядаеш! – спяшаюся шчыра сказаць камплімент, бо яна сапраўды нібы ад візажыста.

— Ты заўважыла? – вытанчаныя бровы ўзляцелі ўгору. – Гэта ж я сёння раніцай новую касметычную маску паспрабавала зрабіць. **Усё проста: бярэш 2 лыжкі свежага тварагу, сыры жаўток ад курынага яйка ды некалькі кропель перакісу вадарода. Толькі трэба ўсе рэчывы добра перамяшаць, каб без камячкоў атрымалася. Трымаеш на твары 10—15 хвілін, пакуль прымаеш ранішнюю ванну – і вось які вынік!**

Трэба і гэта запомніць, – думаю я. – Не заўсёды ж маладая маладой будзе. Гады вунь як бягуць. Хай і гэты рэцэпт у куфэрак ляжа. На самае дно!

Распранаюся ў гардэробе і ўяўляю, як буду зараз пісаць пра пасаг усім нявестам, што чытаюць нашу газету. А побач нехта са старэйшых жанчын распавядае маладзейшай, як можна хутка кашулю мужчыну вымыць, каб выглядала як новая:

— **Трэба з вечара каўнер тальказ добра нацерці. Тальк у любой аптэцы ляжыць побач з дзіцячай прысыпкай – няма праблемы купіць. Затое і раніцай з мыццём ніякай праблемы не будзе.**

— Дзякуй, Васіліса Пятроўна! А то мой на новую працу пайшоў, дык штодня светлую кашулю мяняе. Я ж з іх мыццём пакутую.

Вось яно што – Васіліса Разумніца! Як я раней не ўспомніла? Калісьці мы называлі яе ўпотай Васілісай Прыгажуняй. З цягам часу зразумелі: яна яшчэ і Прамудрая. Шмат карыснага пра замужняе жыццё расказаць можа. І ў пасаг наш нешта дададць не адмовіцца.

Раскрываю блакнот і бягу ўе даганяць. А тое, пра што яна мне раскажа – у наступным выпуску.

Да пабачэння!

Рэцэпт № 1

25 г сметанковага масла перацерці з паштэтам (рыбным, мясным ці пячоначным). Заправіць усё кетчупам, соль ці перац – на ўласны густ. Сумесь намазаць на хлеб, зверху прыкрыць лустачкай марынаванага агурка.

Рэцэпт № 2

2 плаўленыя сыркі здрабніць на бурачнай цёрцы, потым змяшаць са сметанковым маслам. Дабавіць дробна пакрышаныя каўбасу і агурок. Аздобіць зверху гарчыцай. І ўсё разам – на скібку хлеба.

Рэцэпт № 3

Салёнае сала перакруціць на мясарубцы з адвараным мясам (мяса трэба ўзяць у два разы больш, чым сала). Затым перакруціць дзве адвараныя бульбіны. Заправіць сумесь маянэзам – і зноў на хлеб ці батон.



Пасаг пачала сабіраць Надзея ВАЛКОВІЧ.

Кумiры

АЛЯКСАНДР КУЛІНКОВІЧ:

«Шчыра атрымліваецца, калі співаеш на той мове, на якой думаеш»

Гэты год для гурта «Нейро Дюбель» быў вельмі багаты на падзеі. Спачатку каманду абвясцілі «Рок-каралямі» года папярэдняга. Потым Аляксандр Кулінковіч ажаніўся з дзяўчынай, з якой дагэтуль сустракаўся чатыры гады і якая чысціла яго канцэртны смокінг пасля кожнага выступлення каманды – Аляксандр, як заўсёды, катаўся па падлозе і выробляў цуды акрабатыкі. Пасля «Дюбеля» праводзілі ў Амерыку клавішніка Макса Івашына, потым доўга і нудотна высвятлялі адносіны з гітарыстам каманды Юрыем Навумавым, пакуль зусім не справадзілі яго з групы. А затым каманда запісала суперкласны альбом “"Ворсинки и катышки» і скандальна спрэзентавала яго ў Белдзяржцырку, ледзь не на вачах у цінэйджэрскай і не толькі публікі сварачыся з міліцыяй і арганізатарамі канцэрту, прычым у абодвух выпадках Аляксандр Кулінковіч відавочна меў рацыю. Зараз «Нейро Дюбель» збіраецца запісаць «THE BEST» і падацца з ім у Расію.

Дарэчы, канцэрт у цырку яскрава пацвердзіў, што для самага харызматычнага беларускага музыканта ўсіх часоў Аляксандра Кулінковіча таксама маюць дачыненне словы Пола МакКартні, кінутыя ім неяк у 60-х: «Мы можам лёгка накіраваць моладзь супраць урада, але не хочам гэтага рабіць». Забарона міліцыі падчас канцэрту ўставаць з месцаў і выходзіць танчыць да арэны справакавала тое, што Аляксандр заклікаў моладзь «паціхеньку спаўзаць бліжэй да сцэны», «гапата» ў антракце ўжыла «чаромушку», а студэнцкая публіка пачала скандзіраваць «Жыве Беларусь!».

Гурт «Нейро Дюбель» існуе 11 гадоў. Калісьці музыканты пачыналі як дваровая каманда, у песнях якой было вельмі шмат мата. Зараз Аляксандр можа з поўным правам ганарыцца тым, што яго касеты раскупляюцца менавіта з-за тэкстаў – бо ніхто не будзе купляць альбомы, пад якія можна толькі танчыць. У актыве – такі «монстр», як альбом «Охотник и сайгак». Яе доўга папікалі тым, што яна каторы год запар дарэмна намінуецца на «Рок-карону» – пакуль мінулай зімой усе канчаткова, у тым ліку і тэлемагнаты, не пераканаліся, што на ўзроўні «Дюбеля» ў нас няма больш нікога, і ніхто так, як Кулінковіч, не здольны выкладвацца на канцэртах.

Аляксандр не лічыць сябе лепшым з лепшых. Дарэчы, тое, што сам ён кажа пра сябе, часта здзіўляе тых, хто ўяўляе музыканта такім жа скандальна-экспрэсіўным у жыцці, як і на сцэне.

«...Не падабаецца мне думка, што айчынная рок-музыка трымаецца на двух кітах – «Нейро Дюбеле» і «N.R.M.». Так, у нас і ў іх вельмі моцны стыль, мы гучна абвяшчаем пра сябе. Але гэта не значыць, што няма з кім параўнаць. Лічу, што недастаткова ўвагі надаецца былой «Тройцы» і «Крыві». Дарэчы, памыляюцца тыя, хто лічыць, што з камандай Лявона Вольскага мы канкурыруем. У нас вельмі цёплыя стасункі, у штодзённым жыцці таксама. Можна лічыць, што мы сябры.»

«...Тое, што мы гралі на «разагрэве» ў «Сектара газу», не значыць, што мы атаясамліваем сябе з імі. Гэта быў чыста платны канцэрт, бо гурт тады сядзеў на жудаснай «мялі». Яны граюць вельмі ахабную музыку, мы – не.»

«...Не спяваю па-беларуску, бо ў жыцці карыстаюся расійскай мовай. Калі Вольскі думае па-беларуску і спявае па-беларуску – гэта выглядае настолькі ж шчыра, наколькі фальшывым было б, калі па-беларуску заспявалі мы. Тое ж, дарэчы, магу сказаць пра каманды, якія думаюць і жывуць па-руску, а спяваюць па-англійску. Што гэта – жаданне схаваць за незразумелай мовай нецікавыя тэксты»?

Алесь ПАЛЫНСКІ.
Фота Мікалая ЛЯВОНАВА.

Спяніцца і азірнуцца

Вынікі-99

Самы час паглядзець, што адбывалася ў беларускай музыцы ў 1999 годзе, хто каго «забіў», каму выпала быць увенчаным лаўрамі.
Пачнём.

ПЕРАМОГА ГОДА

Беларуская рок-музыка з'явілася ў CD-фармаце, які ў адрозненне ад аўдыякасет мае больш высокую якасць.

Кампакт-дыскі выйшлі ў «Крамы», «Новага неба», «Уліса», «Палаца», «Крыві», «Бонды», «Mojo Blus» і іншых. Гэта так званыя камп'ютэрныя кампакты. Першай рызыкнула вырабіць заводскія кампакты Беларуская музычная альтэрнатыва (БМА). Яе CD «Вольныя танцы: слухай сваё!» – першы беларускамоўны сур'ёзны цэльны праект. Выданне і прэзентацыя CD, яго аўдыя- і відэаварыянты, шырокая рэклама ў беларускіх і некаторых замежных сродках мас-медыя, рассылка па радыёстанцыях – усё гэта лёгка шакіравала (у добрым сэнсе гэтага слова) меламанаў. Праект прыцягнуў увагу да беларускай музыкі замежнікаў. Так, дзякуючы праекту песня «Палаца» «Ночы» трапіла ў расійскі зборнік «НАШЕствие». Выданне CD «Вольныя танцы: слухай сваё!» стала сапраўднай нацыянальнай падзеяй.

Ёсць прарыў і ў папсавікоў: новая кампанія «Бульба-рэкардз» выдала касету «Бульба-хіт». Акрамя адной (ды той з “Каляднага альбома”), усе песні на рускай мове. Ці стануць яны хітамі – пакажа час.

ПАДАРУНАК ГОДА

Яго зрабіў “BOUTIQUE KAMILA”, які выдаў CD «Калядны альбом. Сьвяты вечар 2000».

Канцэпцыя гэтага кампакт-дыска нагадвае «Народны альбом». У праекце былі задзейнічаныя гурты «Крыві» і «N.R.M.», гродзенскі бард Віктар Шалкевіч, дзі-джэй Памідораў і іншыя.

СВЯТА ГОДА

Вядома, гэта Басовішча!

Праводзімае ў Польшчы на грошы польскіх арганізацый, Басовішча застаецца адным з нямногіх месцаў, дзе могуць паказаць сябе ў поўны голас беларускамоўныя каманды – і вядомыя, і маладыя. Нагадаю: Басовішча арганізоўвае Беларускае аб'яднанне студэнтаў Польшчы (БАСП). Адсюль і назва. Праходзіць гэты фэст штогод у сярэдзіне ліпеня у Гарадку на Беласточчыне. У першы дзень адбываецца конкурс маладых гуртоў, у другі – выступаюць пераможцы і госці. Арганізатары фэсту не толькі ўзнагароджваюць (грашыма) маладыя каманды-пераможцы, але і даюць ім магчымасць запісаць альбом у беластоцкай студыі.

У 1999 годзе пераможцам Басовішча стаў малады гурт з Мінска «Exist», які мае ўсе шанцы стаць адкрыццём года.

ПАРАЗЫ ГОДА

1999 музычны год прайшоў пад знакам шматлікіх забаронаў.

Не паспеўшы добра раскруціцца, знікла (была зачынена) праграма «Маладзёжнага радыё» пра беларускую музыку «На ўсю моц». Брэсцкімі ўладамі быў сарваны канцэрт у рамках праекта «Вольныя танцы». Увогуле беларускія ўлады забаранілі або сарвалі больш як дзесяць вулічных канцэртаў. У адказ «Малады фронт» распачаў буйную акцыю пратэсту «Сусветны рок за Беларусь!».

Палітыка ўладаў прывяла да таго, што беларускіх «неугодных» музыкаў часцей можна было ўбачыць дзе хочаш, толькі не на радзіме. Так, «Палац» гастраляваў па Расіі, «Новае неба» з «Улісам» з'ездзілі ва Украіну і ў Польшчу, «N.R.M.» і «Крыві» практычна сядзелі ў Польшчы, а «Народны альбом» можна было пачуць у Францыі і Польшчы.

РАСЧАРАВАННІ ГОДА

Буксуе «Крама».

Пераемніца легендарнай «Бонды», яна так нічым і не парадавала сваіх фэнаў. Вельмі шкада, бо «Крама» – адзін з лепшых беларускіх гуртоў, што мог бы скласці добрую канкурэнцыю замежным камандам. Спадзяюся, гэта адбудзецца ў 2000 годзе.

ЗМЕНЫ ГОДА

Іх было няшмат.

Гурт «Крыві» з-за творчых непаразуменняў пакінуў Юрась Выдронак (ён зараз працуе над асабістым праектам «Юр'я»), а на яго месца прыйшоў Піт Паўлаў («N.R.M.»). Гурт «Нейро Дюбель» разарваў кантракт з кампаніяй «Пан-рэкардз», палічыўшы, што кампанія не зусім прафесійна займалася раскруткай альбома «Охотник и сайгак». Раскруткай новых сваіх праграм каманда «Нейро Дюбеля» будзе цяпер займацца сама.

ЗДАБЫТКІ ГОДА

Цэлы тузін новых праграм!

«Новае неба» – альбом «Цэпеліны», «Крыві» – «Людзям», «Зьніч» – «Дух Зямлі», «Нейро Дюбель» – «Ворсинки и катышки», «Мясцовы час» – «Халі-галі», «N.R.M.» – «Пашпарт грамадзяніна «NRM» і «Акустычныя канцэрты канца XX стагоддзя», «Zygimont Vaza» – «Kambinat», «Кальян» – «Без назвы», Віктар Шалкевіч – «Балады і рамансы», «Postscriptum» – «Дом на синих холмах», «Уліс» – «Падарожжа».

З правінцыяльных гуртоў адзначу «Мясцовы час» – за тое, што вярнуўся на беларускую рок-сцэну, і гомельскі «Gods Tower» – на працягу стольких гадоў ён трымаецца на вышыні.

Сярод маладых запомніліся «Млын», «Склеп», «Exist» і «Без білета».

ПАДТРЫМКА ГОДА

Назавём тых, хто, як і раней, падтрымліваў беларускі рок і дапамагаў яму.

Гэта Алег Клімаў («Музычная газета»), Анатоль і Аксана Вечар («Акалада», «Беларускі хіт-парад» на БТ), Юрый Цыбін («Каўчэг»), Анатоль Марціновіч («Пан-рэкардз»), Віталь Супрановіч і Сяргей Сахараў (БМА), Алесь Суша (“BOUTIQUE KAMILA»), Дзмітрый Падбярэзскі («БДГ»), Віталь Чыжоў («Бульба-рэкардз»), Вітаўт Мартыненка і Анатоль Мяльгуй, і...

Іх многа – неабыякавых да беларускай музыкі. Многія бачаць у ёй і сродак выратавання ў наш час, і залог духоўнага здароўя, і спадзяванні, і раскошу чалавечых зносін...

В.С.

На здымку: гурт «Крама» – расчараванне 1999-га і надзея 2000-га.

X-Files

БМА гучы, музыка!

БМА – Беларуская музычная альтэрнатыва.Так называецца арганізацыя маладых беларусаў, якая з моманту свайго заснавання (1996 г.) займаецца падтрымкай нацыянальнай рок-культуры, распаўсюджвае дэмакратычныя ідэі праз рок-музыку.

Калі вы яшчэ не зразумелі, што такое БМА, мы пералічым яе справы.

Па-першае, БМА правяла шэраг канцэртаў у мінскіх ВНУ з удзелам гуртоў «Новае неба» і «N.R.M.»; нягледзячы на забарону улад, арганізавала фестываль «Рок за незалежнасць», выдала больш як дзесяць аўдыякасет беларускіх музыкантаў («Кардон», «Мясцовы час», «Мроя», Андрусь Мельнікаў і інш.). Штогод разам з газетай «Беларуская маладзёжная» БМА праводзіць фэст «Рок-Купалле».

Па-другое, менавіта з БМА звязаны праект «Вольныя танцы». Гэта пачынаючы з 1998 г. серыя канцэртаў-акцый у розных гарадах Беларусі. У рамках праекта адбыліся выступленні мінскіх гуртоў «Крама», «N.R.M.», «Новае неба», «Тройца» і мясцовых груп «Deviation», «Ветэран скрэпер», «Мясцовы час» і іншых. Дарэчы, у мінулым годзе БМА выдала тысячным накладам (тыражом) першы заводскі беларускамоўны кампакт-дыск «Вольныя танцы: слухай сваё!», які з'яўляецца зборам песень гуртоў, што прымалі ўдзел у канцэртах-акцыях.

Па-трэцяе, у Мінску 14 мая 1998 г. у парку імя Янкі Купалы быў арганізаваны канцэрт у падтрымку палітвязняў, а 6 верасня ў парку імя 50-годдзя Кастрычніка сумесна з «Хартыяй'97» і «Маладым фронтам» – канцэрт, прысвечаны Дню вайсковай славы.

Ёсць і «чацвёртае», і «пятае»...

Кіруе БМА Віталь Супрановіч (нарадзіўся ў 1979 г., скончыў тэхнічнае вучылішча, зараз вучыцца ў Беларускім універсітэце культуры; незалежны журналіст; уваходзіць ва ўправу «Маладога фронта»). Намеснік кіраўніка – Сяргей Сахараў (нарадзіўся у 1979 г., зараз вучыцца ў Педагагічным універсітэце; незалежны журналіст).

Тое, што робіць БМА на Беларусі – падтрымка маладзёжных ініцыятыў у галіне рок-музыкі, – справа вельмі карысная. Самой БМА таксама патрэбна падтрымка. БМА зацікаўлена ў супрацоўніцтве са студыямі гуказапісу, з арганізацыямі і прыватнымі асобамі.БМА спадзяецца згуртаваць вакол сябе сапраўдных сяброў беларускага року, якія хочуць, каб наша музыка заняла належнае месца ў свеце.

Янка ЛУЦЭВІЧ.

Каардынаты БМА:
220085, Мінск, а/с 5;
тэл. (017) 249-08-88,
тэл/факс (017) 284-50-12.
E-mail: aja@cscsc.lingvo.minsk.by

ВИКТОРИНА

В конце марта 1999 года состоялось знаменательное событие – вышел первый в Беларуси фирменный компакт-диск «ВОЛЬНЫЯ ТАНЦЫ: СЛУХАЙ СВАЁ!», на котором собраны композиции лучших рок-групп страны.

А теперь – внимание! – вопросы.

1. Композиций на компакт-диске (CD) 17. А сколько рок-групп участвовало в их записи?

2. Компакт-диск замечателен по нескольким причинам, и одна из них – та, что на одном аудионосителе собрано созвездие рок-королей. Перечислите их.

3. А сколько рок-королев участвовало в записи CD «Вольныя танцы: слухай сваё!»?

4. В обозначении компакт-диска как сборника композиций рок-групп есть одна неточность. На самом деле здесь можно услышать и голос мэтра белорусской эстрады из одной ве-е-есьма известной поп-группы. Кто это? И о какой композиции идет речь?

Ответы отправляйте по адресу: 220030, Минск, пл.Свободы, 23, редакция газеты «Рабочы».

Первым трем правильно ответившим на все вопросы викторины читателям редакция вместе с БМА (Беларускай музычнай альтэрнатывай) вручит призы – компакт-диски «Вольныя танцы: слухай сваё!».

Ответы принимаются только в письменном виде. Обязательно укажите свой телефон.

Вопросы викторины подготовлены БМА.

ВОЛЬНЫЯ ТАНЦЫ



АМУРНЫЙ ГОРОСКОП


ФЕВРАЛЬ	1,2,3,4	5,6	7,8,9,10,11	12,13,14	15,16,17	18	19,20	21,22	23,24	25,26	27,2
ОВЕН	♠	✌	✿	♥	❥	✍	♣	✂	♥	✿	♠
ТЕЛЕЦ	✿	✂	♣	✍	♥	✿	✌	🍎	➹	♥	♠
БЛИЗНЕЦЫ	✂	✌	✍	✿	♣	♥	♣	✌	✿	➹	♥
РАК	♥	♣	✌	🍎	➹	✂	♥	✂	➹	✌	✍
ЛЕВ	🍎	✌	♥	✿	✌	❥	✂	♣	♥	➹	➹
ДЕВА	♠	✍	🍎	✿	♥	➹	✌	♣	♠	♥	✂
ВЕСЫ	❥	✍	✿	♠	✿	➹	🍎	♥	✍	✌	❥
СКОРПИОН	🍎	➹	♠	✌	➹	♥	♣	✂	🍎	♠	✿
СТРЕЛЕЦ	✌	♣	❥	✂	♥	✌	✿	🍎	♥	♠	➹
КОЗЕРОГ	♥	♠	✂	♥	✿	♣	🍎	♥	✍	✿	♠
ВОДОЛЕЙ	♣	✿	♣	♥	♠	✍	✌	✿	➹	♥	✂
РЫБЫ	❥	➹	✿	♠	✌	✂	♥	♣	✿	♠	✌

"Февраль, достать чернил и плакать..."

Как прав был поэт Борис Пастернак: вот так взять пишущую ручку, написать записку любимому человеку и... поплакать – самый подходящий месяц в году. Плакать можно как от любви, так и от нелюбви. Февраль – стихия Водолея. Это месяц, когда наша личная жизнь бывает волнительной, и даже очень (учитывая, что на середину февраля припадает День святого Валентина – День всех влюбленных), но никогда серой и однообразной. В феврале, как ни в каком другом месяце, много выяснения старых и завязывания новых отношений, это месяц, когда владычествуют Сатурн и Уран: Сатурн – планета грусти, Уран – планета действия. Будьте особенно осторожны со своими чувствами, не принимайте резких, окончательных решений.

Астролог Елисей РОДИОНОВ.

♥ – внезапная влюбленность
✿ – приятное знакомство, маленькое романтическое приключение
♠ – ревность, муки неразделенной любви, непонимание, обида
❥ – в вас влюбился человек, которого вы не заметили и прошли мимо
✍ – будьте внимательны к любящим вас: напишите им хотя бы пару строк – это принесет всем облегчение
✂ – вам завидуют: ждите острых подколок
🍎 – возвращение старой любви, но не надолго
♣ – вас любят, но корыстно
➹ – вмешательство в вашу личную жизнь близкого человека с тем, чтобы разлучить вас с предметом любви
✌ – к вам пришла удача; поверьте в нее и не требуйте от любимого человека многого



Письмо в номер

Когда мы только верстали номер, к нам пришло письмо. Именно пришло – "своими ногами". Заглянула в редакцию, чтобы оформить подписку на газету (у нас гораздо дешевле, чем на почте), минская десятиклассница Люда ПОГОДИНА, узнала про "Фішку" и вот – письмо. Первое. И потому очень дорогое.

ВСЕ ЧЕГО-ТО ЖДУТ

Молодежь – это будущее. Будущее – по надеждам – должно быть светлым. А так ли оно выхо...?

По своему опыту могу судить и сужу: с одной стороны, молодое поколение – развитое, осведомленное обо всем больше, чем старшее, озабоченное проблемами, какую профессию выбрать, как жить; а, с другой стороны, апатичное. У многих фантазии хватает лишь на ежевечерние посиделки "под крышей дома своего", а у более общительных – посиделки на тусовках, где, в принципе, круг знакомых тоже не часто пополняется новыми интересными людьми.

Хорошего мало. Хотя, конечно, сегодня любой может найти себе занятие по душе, будь то восточные единоборства или спортивные бальные танцы, рок-группа или группа по изучению иностранного языка. То есть можно легко обзавестись обществом молодых людей, схожих по интересам и мировоззрению.

Надо найти свой мирок. Увлечься и отвлечься. А вот от чего и для чего – ответьте на эти вопросы сами.

И напоследок – одно из моих стихотворений "в тему":

Суета

Столько разных судеб,
Столько разных дел...
Столько словоблудий,
Мыслей и идей...

Все спешат куда-то,
Все чего-то ждут...
От любви до смерти –
Несколько минут.

Никогда не знаешь,
Что произойдет.
Может быть, подарок
Случай принесет.

Если есть надежда,
А душа чиста...

"Начинай почаще с нового листа" – так закончили стихотворение Людмилы Погодиной мы в редакции. А как бы закончил его ты, наш читатель?

Напиши.

Вообще, можешь писать обо всем. Пусть у других будут, как указала Люда, восточные единоборства или иностранные языки, а у тебя: такая вот фишка – писать письма "Фішцы". Все (ты понял: ВСЕ) письма я опубликую ровно через месяц, когда выйдет второй номер.

Короче: встретимся через 28 дней!

Мой адрес: 220030, г.Минск, пл.Свободы, 23. Газета "Рабочы", "Фішка".

Вливайся!

Абвесткі

✻ Прадаецца хлопчык на пабягушках. Прабег 300 км.

✻ Паступіла ў продаж новая цацка "Карлсан". Лётаць – не лётае, але варэнне жрэ.

✻ Прадаецца тата. Спытаць Паўлюка Марозова.

✻ Шукаю ідэйную жанчыну бел-чырвона-белага колеру для сумеснай барацьбы супраць ворагаў. Маю грошы для першага тэракту.

Нашы справы настолькі кепскія, што ворагаў у нас больш няма. Засталіся толькі спачуваючыя.

Разговорчики

– Девушка, с вами можно познакомиться?
– Нельзя!!!
– Ну и слава Богу.

– Слышали, Виталика током убило.
– А как?
– Да аккумулятор на голову упал!

– С тобой бывает такое, что ты слышишь голос, но не знаешь, кто говорит и откуда?
– Конечно, бывает! И часто.
– О, ужас!
– Конечно, бывает, когда снимаю трубку телефона.

Мысля апасля

Колькі не чырыкай, а хочацца і пакляваць.

Жывым з жыцця не пайсці!

Дай нам волю – дык мы абнясём яе калючым дротам.

Рецептики для студенческой столовки



"ЛЕТЯТ УТКИ"

Утки обыкновенные жареные. Оригинален лишь способ их подачи: они разбрасываются вручную с дальнего конца стола.

"БОРЩ ПО-УЗБЕКСКИ"

Готовится так же, как и по-украински, но поедается сидя на корточках из общей кастрюли двумя руками.

"СУП С КОТОМ"

Самое главное не говорить голодным студентам, из чего сварен суп. Они должны узнать об этом ПОТОМ!..



Нынешняя эпидемия гриппа, вызванная так называемым сиднейским вирусом, уже привела к заболеванию более 6 000 000 человек в Англии и Франции.

ЗДОРОВЬЕ

ГРИППУЕМ...

К той информации про грипп, которую "Рабочы" поместил в прошлом номере, мы хотим добавить сегодня советы опытного врача Александра АНДРЕЙЧУКА.

Да, гриппуем... Есть в этом выражении некая фатальность, обреченность. Между тем эпидемия никак не может охватить абсолютно всех, и вы должны это понимать. Активность вируса гриппа измеряется так: болеют 4 тысячи человек из 100 тысяч. В почти двухмиллионном Минске этой зимой может перегрипповать максимум тысяч 70–80. Ваша задача – не попасть в их число.

Что нужно сделать?

Проконсультируйтесь с терапевтом, лечащим врачом: возможно, еще не поздно сделать прививку от гриппа. Это либо укол, либо капли в нос. **Вакцина** – самое лучшее средство, вакцина гораздо эффективнее, чем **оксолиновая мазь** или **интерферон**. Все мои пациенты по моему совету прошли вакцинацию, причем они утверждали, что в прививочных кабинетах не было очередей. Впрочем, очень может быть, что в вашей районной поликлинике все иначе. Но в любом случае стоит туда обратиться.

(Замечу: эпидемия гриппа этой зимой разразилась прежде всего в тех странах, где вакцинацию провели плохо, упустили так называемую **группу риска** – это люди преклонного возраста, те, кто болеют сердечно-сосудистыми и легочными заболеваниями, а также дети.)

Кроме группы риска шанс заболеть гриппом – у неосведомленных и ленивых ("вот еще, вакцинацию какую-то придумали"), и, наоборот, у очень занятых людей.

Если вы все же заболели (почувствовали головную боль, ломоту во всем теле, слабость, у вас появился насморк, сухой кашель, повысилась температура) – немедленно обращайтесь к врачу и ложитесь в постель.

В прошлом номере газета абсолютно правильно написала, что бороться с температурой нужно только тогда, когда она превысила 38-38,5 градуса. Однако хочу предупредить: не пейте анальгин – он вам не поможет. Не принимайте амидопирин – он токсичен. Используйте **ацетоминофен, парацетамол** или **диклофенак.** Немногие знают, что лучше всего запастись ректальными свечами **"цефекон"** и **"клофен"** – с их помощью вы снимете высокую температуру и избежите побочных нежелательных последствий для желудочно-кишечного тракта.

Особенно осторожно сбивайте температуру у детей. **При гриппе категорически противопоказано использование аспирина, который может вызвать у ребенка синдром Рея – печеночно-мозговую недостаточность, потерю сознания и смерть.** Опасность подстерегает прежде всего детей 2–6 лет (1 случай на 5000 заболеваний). Прошлой зимой в Минске так погибли 4 ребенка. Измеряйте у детей температуру несколько раз в день и будьте готовы немедленно обтереть больного разведенным уксусом, водкой.

При гриппе встает вопрос: принимать антибиотики или нет? В первой, начальной, стадии болезни это не имеет большого смысла. Но во второй стадии, начиная с 5-6-го дня заболевания, когда человек чувствует улучшение, а кое-кто совершает преступление против собственного здоровья и бежит на работу или на лекции, к гриппу может присоединиться вторичная бактериальная инфекция и вызвать воспаление легких, отит, воспаление синусовой пазухи верхней челюсти. Поэтому я бы рекомендовал и взрослым, и детям принимать в этот период **амоксициллин** ("жульфамокс"), **эритромицин** и **цефалексин**. Взрослым можно использовать **бисептол, бактрим.**



Не стесняйтесь лишний раз проконсультироваться с врачом или вызвать "скорую помощь". Не будьте фаталистами: многое зависит от вас самих.

Если у вас, дорогие читатели, есть вопросы относительно этого или другого заболевания, вы можете написать нам: 220030, г. Минск, пл. Свободы, 23, "Рабочы". Доктору Андрейчуку.

РУЧНАЯ РАБОТА

СВЕЖЫ ХВОСТ

Ці ведаеце вы, як зімой рыбу ловяць невадам?

І я не ведаў, пакуль сусед маёй маці Валодзік, які ўжо каторы год узначальвае ў калгасе невялікую рыбацкую арцель, не прапанаваў:

— Як маеш вольны час і жаданне — паехалі з намі.

Я згадзіўся.

Неўзабаве з'явіўся калгасны трактар з прычэпам. На прычэпе — шасцёра мужчын.

— А ці не многа нас будзе? — пытаюся з жартам, бо ведаю, што рыбацкая арцель афіцыйна налічвае тры чалавекі.

— Нават мала,— сур'ёзна адказвае Валодзік.

Мы закінулі ў прычэп невад, некалькі скруткаў вяроўкі, доўгія гнуткія жэрдкі, ледарубы, некаторыя іншыя прылады і паехалі.

... Брыгадзір першым ступіў на лёд, агледзеўся, выбіраючы месца лоўлі. Гадоў дзесяць таму Нёман адшукаў другое рэчышча, а старое з цягам часу ператварылася ў звычайнае возера. Мароз быў невялікі, але дзьмуў пранізлівы вецер. За дваццаць хвілін, пакуль доўжыўся пошук месца, мы замерзлі, хоць і былі цёпла апранутыя. Нарэшце, Валодзік крыкнуў:

— Знайшоў!

Коля, малады хлопец, прапанаваў:

— Давай сагрэемся.

Рыбацкі рытуал быў кароткі, і, як толькі чарка абышла круг, мы прыняліся за працу.

Брыгадзір пазначыў на лёдзе квадрат не менш як два на два метры, і чацвёра мужчын пачалі рабіць палонку. Астатнім Валодзік загадаў біць невялічкія лункі да аднаго і другога берагоў Нёмана і далей уздоўж берагоў. Адлегласць паміж лункамі — метраў дзесяць — сярэдняя даўжыня жэрдкі.

Я ўзяўся за кайло. Лёд быў не надта тоўсты, работа здавалася простай. Махай сабе ломам! Першая лунка, другая, трэцяя... Адчуваю, што сагрэўся без ста грамаў. Аглядваюся на іншых: пяць хвілін працуюць, пяць — смаляць цыгаркі. Як пачаў біць шостую лунку, адчуў боль у далоні. Здымаю рукавіцу. Нічога сабе! Муляк! Я яго не толькі нацёр кайлом, але і раздавіў.

Брыгадзір і не глядзіць у мой бок. У яго свой клопат: побач з палонкаю раскласці невад. Робіць ён гэта акуратна, але старэйшы Мікола папярэджвае:

— Глядзі, каб не заблытаўся!

— Сам ведаю,— бурчыць Валодзік.

... Мы ужо гадзіну б'ём лункі. Лаўлю сябе на думцы, што лепш было застацца дома. Хлопцы, што закончылі біць адну палонку, пачынаюць рабіць другую, яшчэ большую: у першую мы будзем запускаць невад, а даставаць яго з другой. Заўважаю, што не ў аднаго мяне расцёртыя да крыві далоні, і на душы становіцца цяплей.

Але вось усе палонкі і лункі зроблены, ачышчаны ад бітага лёду.

— Можа, яшчэ сагрэемся? — мармыча Коля.

Брыгадзір цыкае:

— Не!

У палонку пад лёд запускаюцца жэрдкі з прывязанымі да іх вяроўкамі, кожная — у сваім накірунку. Жэрдка пераходзіць ад лункі да лункі, ведучы за сабой вяроўку. Вось пад ваду пайшла сетка. Цераз некалькі лунак дастаецца з вады вяроўка, і ўжо трэба натужвацца, каб цягнуць невад. Дзесьці праз пяць лунак цягнуць кожнае крыло невада далучаецца яшчэ па адным чалавеку. Мокрая вяроўка ўпіваецца ў рукі. Працуем без рукавіц — яны даўно ўжо мокрыя, вяроўка слізгае па іх.

Нарэшце невад схаваўся пад ваду, але цягнуць нам яго яшчэ доўга — палову ад таго, што прайшлі. Кожны крок даецца ўсе цяжэй. Раптам нехта падае голас:

— Зачапіліся!

Гэтага толькі не хапала!

Кароткі снежаньскі дзень вось-вось скончыцца, а дзе ж наш «свежы хвост»?!

Валодзік хутка знайшоў прычыну: невад зачапіўся за лёд, які ўтварыўся на месцы старой лункі — нехта ўжо тут рыбачыў. Брыгадзір сам узяўся за кайло, прабіў лёд і адчапіў сетку.

Маё адзенне намокла і пакрылася ледзяною коркай. Ну, калі ж галоўная палонка?! Апошнія метры даюцца неймаверна цяжка, мы цягнем што ёсць моцы. Брыгадзір падхоплівае ніз сеткі, каб рыба не ўцякла з невада. Мне мроіцца, што ўлоў багаты, але наверх выцягваюцца невялікія рыбкі.

Вось і ўсё. Невад на лёдзе.

— Не так і кепска,— зазначае хтосьці за маёй спіной.— Кілаграмаў дзесяць.

Я не ведаю — многа гэта ці мала. Рыбакі спешна перакідваюць рыбу ў мяшок. Трапляюцца нават вялікія шчупакі.

Рыба змерзла. Змерзлася сетка. Абледзянеў увесь інструмент. Абледзянелі і замерзлі мы. Чорным валам коціцца ноч.

Выратаваць можа толькі вогнішча.

Вогнішча! Не, нездарма згублены дзень. Дастаём дамашнія прыпасы, той-сёй вымае пляшку. Ніхто нікуды не спяшаецца. Сядзім, закусваем... Завязваецца мужчынская гутарка, падчас якой я чую, што ў мінулым годзе на Нёмане за адзін раз было вылаўлена амаль тры тоны рыбы. Быў ледастаў, лёд трашчаў, рыба шукала паратунку ў старыцах ды затоках, вось таму і налавілі шмат.

Валодзік прымае мудрае рашэнне: няма сэнсу сённяшні ўлоў здаваць у краму. І мы дзелім яго паміж сабой. Кожнаму дастаецца крыху больш за кілаграм.

На развітанне Валодзік пытае ў мяне без усялякага гумару:

— Як табе наша праца?

Язэп ПАЛУБЯТКА,
рака Нёман.

ШКОЛА ВЫЖИВАНИЯ

ПО ТОНКОМУ ЛЬДУ



Если вы провалились на льду реки или озера, широко раскиньте руки, чтобы удержаться от погружения с головой. Выбираться из полыньи нужно в том направлении, откуда вы пришли. Старайтесь не обламывать кромку. Не делайте резких движений. Наползайте на лед грудью, ноги вытаскивайте поочередно. Главная тактика — принаравливать тело для наиболее широкой площади опоры. Выбравшись на лед, не торопитесь вставать на ноги — откатитесь, а затем ползите туда, откуда пришли. И только оказавшись на берегу, вставайте и бегите, чтобы согреться.

Если на ваших глазах провалился человек, крикните ему, что идете на помощь. Приближаться к полынье можно только ползком. К краю полыньи подползать нельзя, иначе в воде будут уже двое. Чтобы вытащить беднягу, бросьте ему шарф, ремень (лучше, конечно, веревку). Сгодится доска, даже санки, лыжи. Если вы не один, товарищи, взяв друг друга за ноги, ложатся на лед и цепью двигаются к пролому. Действовать надо решительно и споро, чтобы намокшая одежда не утащила пострадавшего под лед.

Любители подледного лова должны знать, что нельзя: пробивать рядом много лунок, делать лунки на переправах, собираться большими группами в одном месте, ловить рыбу у промоин. Зато надо: всегда иметь под рукой прочную веревку 12--15 метров.

Любому, кто решил пройти по льду, надо иметь с собой крепкую палку — пешню — и ею, а не ногой, проверять прочность льда. Если после первого удара пешней на льду появляется вода, немедленно идите назад, причем первые шаги надо делать, не отрывая подошв от льда.

ПРОГРАММА ТВ

ЧЕТВЕРГ, 3 ФЕВРАЛЯ

БТ

6.30, 7.10 Доброе утро, Беларусь!
7.00 Новости.
8.15 «Сегодня с вами...».
8.40 Потребительская корзина.
9.00 Новости.
9.10 Королевская охота.
9.40 Мультфильмы.
10.05 «Волшебник Изумрудного города». Спектакль. Часть 2-я.
11.00 Новости.
11.10, 19.50 «Кофе с ароматом женщины». Телесериал.
11.50 Мультфильм.
12.05 Наш край. Из истории г.п.Лельчицы Гомельской области.
12.25 «Родное слово». Тележурнал.
13.00 Новости.
13.15 «Человек из черной «Волги». Худ.фильм («Беларусьфильм»).
15.00 Новости.
15.10 Видеокурс итальянского языка. Передача 2-я.
15.35 Видеокурс английского языка. Передача 28-я.
16.00 ТВ - школе. Музыка. 7-й класс. «Музыкальный образ».
16.30 Гости в дом. «Наши соседи: Литовская Республика».
17.00 Новости (с/ с).
17.10 «Романсы». Фильм-концерт.
17.30 «Константин Заслонов».
17.55 Х.ф «Попугай».
18.40 Международные спортивные новости.
19.00 Новости.
19.20 Политические диалоги.
20.30 Видеозарисовка.
20.40 Колыбельная.
21.00 Панорама.
21.40 Событие.
21.55 Крок-2. Молодежная музыка: миф или реальность? Прямая линия.
22.40 Комедия «Частный детектив, или Операция «Кооперация».
0.15 Криминальная хроника.
0.20 Новости.

ОРТ

08.00, 11.00, 14.00, 17.00, 23.10 Новости.
08.15, 16.00 «Нежный яд». Сериал.
09.15 Маски-шоу.
09.45 Человек и закон.
10.30 Сериал «Новые приключения Синдбада».
13.30 Программа «Вместе».
14.20 Мультсериал «Охотники за привидениями».
14.40 Семь бед - один ответ.
15.00 Программа «100%».
15.25 ...До шестнадцати и старше.
17.25 «Каламбур».
17.55 Процесс.
18.45 Погода.
18.50 «Девушки с характером». Сериал.
19.45 Спокойной ночи, малыши!
20.00 Время.
21.00 Худ.фильм «Кто, если не мы».
22.40 Фотоателье «Тихого дома».

РТР

06.00, 07.00, 08.00, 16.00, 18.00, 20.00, 00.00 Вести.
07.15, 22.35 Телеспецназ: «Дежурная часть».
08.20 Квантовая медицина.
08.30 «Арена - спорт».
09.00 Гомеопатия и здоровье.
09.10 «Цыганка». Сериал.
10.00 «Лето нашей тайны». Сериал.
10.55 «Лечение Василия». Мультфильм.
15.30 «Секретные агенты». Мультсериал.
16.20 «Башня».
17.05 Сериал «Жара в Лос-Анджелесе-II».
18.30 «Петербургские тайны». Сериал.
19.25 Клуб «Белый попугай».
20.45 Боевик «Проект «А-II».
22.50 «Кино+ТВ».
00.20 Баскетбол. Евролига. ЦСКА - «Тофаж».
01.55 Прогноз погоды.

НТВ

05.00, 05.30, 05.45, 06.00, 06.30, 06.45, 07.00, 07.30 Сегодня утром.
05.15, 07.15 Спорт, погода.
05.20, 06.15, 17.40 Криминал.
05.35, 07.45 Интересное кино.
05.50, 07.20, 16.25 Впрок.
06.20 Карданный вал.
06.35 Мультфильм.
06.50 Большие деньги.
07.55, 19.50 Сериал «Агент национальности безопасности».
09.00, 11.00, 13.00, 15.00, 18.00, 21.00 Сегодня.
09.25 Независимое расследование с Николаем Николаевым.
10.15 Большие родители.
10.45 Мультфильм «Кот в сапогах».
11.30 «Старый телевизор» вспоминает: «Короли и капуста».
13.30 Остросюжетный фильм «Акванавты».
15.35 Сериал «Лоис и Кларк. Новые приключения Супермена».
16.40 Интересное кино.
16.50 «Любовь и тайны Сансет Бич».
18.40 Герой дня.
19.05 Телеигра «О, счастливчик!».
21.45 «Женский взгляд» Оксаны Пушкиной.
22.20 Сегоднячко.
23.10 Сегодня в полночь.
23.30 Худ.фильм «Выстрел».

КУЛЬТУРА

17.05 Поклонникам Терпсихоры.
17.20 «Мы и «золотой миллиард».
17.30 Новости.
17.40 «Российский курьер».
18.20 «Время музыки».
18.45 «Кумиры».
19.10 Вечерняя сказка.
19.20 «Приключения Болека и Лелека». Мультсериал.
19.30, 23.00 Новости культуры.
19.50 «Падение Сайгона». Док.фильм.
20.40 После новостей...
21.00 «Здесь осталась его душа».
21.35 «Пивовар». Сериал.
22.30 Джазофрения.

"РАДЫЁ СВАБОДА" — ДАЙДЖЭСТ

Матэрыялы рубрыкі "Радыё Свабода" — дайджэст" друкуюцца на мове арыгінала — беларускай "тарашкевіцы".

МАРШ СВАБОДЫ-2

Марш Свабоды-2 адбудзецца ў беларускай сталіцы 15 сакавіка й распачне «Вясну 2000» - ланцуг апазыцыйных акцыяў, пра якія абвесьцілі палітыкі «новай хвалі». На сумеснай прэсавай канфэрэнцыі прадстаўнікі БНФ «Адраджэньне», «Народнае Грамады, «АГП і «Хартыі-97» заявілі, што разьлічваюць на ўдзел у акцыях 150 тысячаў чалавек.

Наступная масавая акцыя адбудзецца 25 сакавіка, на Дзень Волі. Яе галоўны сэнс — барацьба за захаваньне беларускае незалежнасьці. Завершыць «Вясну 2000» Чарнобыльскі Шлях 26 красавіка.

Сярод веснавых манфэстацыяў апазыцыі былі таксама названы акцыя моладзі «Беларусь у Эўропу» 14 лютага, акцыя аўганцаў 15 лютага, акцыі прадпрыймальнікаў і прафэсійных зьвязаў.

Пра сваю кансалідаваную пазыцыю на прэсавай канфэрэнцыі заявілі ініцыятары «Вясны 2000» — Вінцук Вячорка й Віктар Івашкевіч ад БНФ, Анатоль Лябедзька, Павал Данэйка і Аляксандар Дабравольскі ад АГП, Мікола Статкевіч ад «Народнай Грамады» і Зьміцер Бандарэнка ад «Хартыі-97».

Як заявіў старшыня БНФ «Адраджэньне» Вінцук Вячорка: *«У выніку "Вясны 2000" мусіла б паўстаць сытуацыя, у якой рэжым альбо пагадзіўся б на перамоўны працэс, і мы б выйшлі на сапраўды дэмакратычныя, міжнародна прызнаныя выбары, альбо ўзьнікла б сытуацыя, у якой рэжым мусіў бы сысьці. Акцыі "Вясны 2000" павінны быць зьвязаныя ў суцэльны ланцужок, і, што вельмі важна, — усе акцыі мы ладзім разам. Ня будзе падзелу на партыйныя інтарэсы».*

Вінцук Вячорка падкрэсьліў таксама, што з набліжэньнем 26 сакавіка — дню выбараў прэзыдэнта Расеі — узрастае небясьпека актывізацыі інтэграцыйных працэсаў. Менавіта таму старшыня «Народнае Грамады» Мікола Статкевіч асноўным вынікам «Вясны 2000» назваў беларускую незалежнасьць: *«Гэты год стане вырашальным для беларускай незалежнасьці, на жаль. Могуць быць прынятыя захады ў дачыненьні да яе з боку новага рэжыму ў Расеі».*

Паводле словаў спадара Бандарэнкі, у Маршы Свабоды возьме ўдзел блізу 150 тысячаў чалавек. Марш, як разьлічваюць арганізатары, пройдзе ад пляцу Якуба Коласа да пляцу Незалежнасьці, бо 15 сакавіка - дзяржаўнае сьвята, Дзень Канстытуцыі.

На прэсавай канфэрэнцыі была выказаная перасьцярога з нагоды магчымых правакацыяў уладаў, што, як лічаць ініцыятары першага Марша Свабоды, мела месца 17 кастрычніка летась. Таму, як паведаміў намесьнік старшыні АГП дэпутат Анатоль Лябедзька, арганізатары будуць зьвяртацца і ўжо зьвярнуліся ў міжнародныя арганізацыі.

Назіральнікі зьвярнулі ўвагу на адсутнасьць на сёньняшняй прэзэнтацыі прадстаўнікоў Беларускага Народнага Фронту пад кіраўніцтвам Зянона Пазьняка. Выконваючы абавязкі старшыні Кансэрватыўна-хрысьціянскае партыі БНФ Юры Беленькі паведаміў, што акцыі, накіраваныя на захаваньне незалежнасьці, будуць падтрыманыя партыяй БНФ. Сябры гэтае партыі будуць браць удзел у акцыях «Вясны 2000».

На здымку: *аргкамітэт акцыі «Марш Свабоды-2».*



ЧАЧНЯ: ГЕНЕРАЛАМ РАЮЦЬ ЗМЯНІЦЬ ТАКТЫКУ

Некаторыя маскоўскія аналітыкі прапаноўваюць Крамлю зьмяніць тактыкуў дачыненьні да Чачні. Напрыклад «Независимая газета « зьмясьціла артыкул Мікіты Малчанава і Армэна Ханбабяна пад назовам «Надыйшоў час зьмяніць тактыку»...

Аўтары прызнаюць, што расейскія войскі вельмі няхутка выйдуць з Чачні, што да прэзыдэнцкіх выбараў Чачня ня будзе пераможаная, і што Басаева і Хатаба арыштаваць ня здолеюць. «Адзінае, што можна прадказаць з абсалютнай пэўнасьцяй, гэта — партызанскія войны. Дзе б фэдэралы не вывешвалі трыкалёр, гэтая зона ня будзе вольная ад «бандытаў». Больш за тое — напады на расейскіх вайскоўцаў ня спыняцца нават у гіпатэтычным выпадку разьмяшчэньня фэдэральных падразьдзяленьняў у кожным чачэнскім паселішчы», — піша газэта.

Пасьля такога прызнаньня лягічна было б прапанаваць мірны, палітычны варыянт развязаньня канфлікту. Аднак, аўтары выказваюцца за нешта зусім супрацьлеглае. Спасылаючыся на зьвесткі пра тое, што ў баях з сіламі чачэнскага супраціву «ужо цяпер бяруць удзел мабілізаваныя з расейскіх турмаў чачэнскія ж крымінальнікі», аўтары прапануюць перайсьці да «тактыкі, якую савецкія спэцпадразьдзяленьні выкарыстоўвалі ў пасьляваенных Прыбалтыцы і Заходняй Украіне». «Ня можа быць, — адзначаецца ў «Независимой газете», — каб у адпаведных расейскіх інстанцыях не памяталі пра псэўдабанды, псэўдападпольныя яўкі, псэўда-бацькоў і гэтак далей, пра што сёньня выдаецца вялікая колькасьць мэмуараў. Чаму ўсяго гэтага няма ў Чачні? Больш чым незразумела».

Прыгадваюць аўтары і здушэньне руху басмачоў у Сярэдняй Азіі, калі «усяго за дзесяць-дванаццаць гадоў удалося ня толькі цалкам разьбіць бандытаў, якіх падтрымлівалі з замежжа, але і перакрыць межы толькі што адроджанай дзяржавы». Праўда, не прыгадваецца, колькі за гэтыя «усяго 10-12 гадоў» загінула і з аднаго, і з другога боку.

Артыкул мае падзагаловак: «Расейскім уладам варта скарыстаць савецкі вопыт антыпартызанскіх апэрацыяў». Відавочна, маецца на ўвазе, так бы мовіць, «станоўчы вопыт» - бо быў яшчэ і адмоўны, калі за шаснаццаць гадоў суперузбройным савецкім войскам не ўдалося перамагчы афганскіх маджахедаў. Акрамя таго, у гісторыі СССР былі і іншыя акцыі супраць партызанаў. На тэрыторыі Беларусі, помсьцячы за пушчаныя пад адхон ваенныя эшалёны, нямецкае камандваньне падчас карных апэрацыяў вынішчала цэлыя вёскі. Падрабязна пра арганізатараў і ідэйных натхняльнікаў тых антыпартызанцкіх акцыяў можна прачытаць у матэрыялах Нюрнбергскага працэсу.

ЦІ ВЕРНЕЦЦА НА БЕЛАРУСЬ ЯДЗЕРНАЯ ЗБРОЯ?

Днямі ў Расеі прынятая новая дактрына нацыянальнай бясьпекі, якая, паводле ацэнкі некаторых экспэртаў, можа зрабіць сьвет больш небясьпечным, чым ён быў месяц таму. А прадстаўнік беларускага Міністэрства абароны заявіў, што пры пэўных абставінах на тэрыторыю Беларусі можа быць вернутая ядзерная зброя.

Новая дактрына нацыянальнай бясьпекі Расеі вызначаецца шмат якімі палажэньнямі, але галоўнае, што выклікала засьцярогу паніжаны так званы парог выкарыстаньня ядзернай зброі.

Папярэдняя дактрына, прынятая тры гады таму, прадугледжвала выкарыстаньне ядзернага арсэналу толькі ў выпадках зьнешняй пагрозы нацыянальнаму сувэрэнітэту. Пры гэтым мелася на ўвазе, што і агрэсар выкарыстоўвае ядзерную зброю ці патэнцыйна можа яе скарыстаць. Цяпер - ядзерная зброя можа быць прыменена і ў тых выпадках, калі праціўнік ня мае ядзернай зброі, аднак расейскае камандваньне скарыстала ўсе іншыя магчымыя спосабы.

Папросту кажучы, калі раней ядзерны арсэнал разглядаўся хутчэй як аргумант стрымліваньня тых, хто валодае аналягічнай зброяй, дык цяпер ён выступае ў якасьці актыўнага сродку, скарыстаць які, пры вялікім жаданьні, можна пры розных нагодах.

Амерыканскі эксперт Дон Джэнсан дзесяць гадоў таму ўдзельнічаў у якасьці інспэктара ў працэсе ядзернага раззбраеньня тагачаснага СССР. Змену расейскай ядзернай дактрыны ён пракаментаваў так:

— Мне падаецца, тут адлюстраваньне слабасьці, а ніяк ня моцы дзяржавы. Звычайныя ваенныя падразьдзяленьні Расеі не падрыхтаваныя ў прафэсыйным сэнсе, пра што сьведчаць і няўдачы ў чачэнскай вайне. Камандваньне стратэгічных сілаў бачыць, што іхняя зброя хутка стане састарэлай -- у той час як ЗША пляную стварыць антыракетную сыстэму. Расейскі ўрад бачыць вялікую пагрозу з боку НАТА і навогул Захаду. І расейскі ўрад лічыць патрэбным рэагаваць на гэтыя выклікі, нягледзячы на тое, што яму трэба знаходзіць грошы і рэсурсы на ўнутраныя рэформы, асабліва ў галіне эканомікі. Што тычыцца магчымасьці вяртаньня ў Беларусь ядзернай зброі... Я ня думаю, што так адбудзецца, бо гэта б парушыла шэраг міжнародных эўрапейскіх пагадненьняў у справе бясьпекі. Ды і ў ваенным аспэкце такі крок не нашмат паспрыяў бы Расеі. Яна і без таго мае ядзерную зброю на сваёй тэрыторыі. Разьмяшчэньне ж такой зброі на тэрыторыі Беларусі , Украіны альбо Казахстану паставіла б пад пагрозу бясьпеку Заходняй Эўропы, што забаронена міжнароднымі пагадненьнямі. Відавочна, размовы пра вяртаньне ядзернай зброі ў Беларусь — заявы, разьлічаныя на палітычны эфэкт, мэта якога — яшчэ раз нагадаць пра ролю Расеі на міжнароднай арэне.

Яшчэ больш рашуча выказаўся прэзыдэнт украінскага Цэнтра палітычных дасьледваньняў Анатолі Грыцэнка, да якога таксама звярнулася беларуская рэдакцыя "Свабоды":

— Гэта прывяло б да маланкавых дзеяньняў з боку Украіны. Гэта рэзка пагоршыла б адносіны Кіева і з Масквой, і з Менскам, а таксама паклікала б асімітрычныя адказы Кіева.

РАСЕЮ ПАЗБАВІЛІ ПРАВА ГОЛАСУ

Першы намеснік прэм'ер-міністра і міністар фінансаў Расеі Нікалай Касьянаў прызнаў, што кошты на вядзенне чачэнскай вайны падвышаюцца. Ён заявіў, што ў апошнія месяцы ўрад планаваў выдзяліць каля 130 мільёнаў долараў ЗША на аперацыю ў Чачні, а патраціў 180 мільёнаў долараў. Прадстаўнік расейскага ўраду ў Чачні Нікалай Кошман паведаміў, што на адбудову сталіцы Чачні Грознага спатрэбіцца 1 мільярд долараў ЗША.

Большыя дэбаты ў Расеі звязанныя з чалавечымі стратамі. Усяго, паводле агенцтва Інтэрфакс, было забіта ў вайне больш за 900 салдатаў, прычым 529 у апошні месяц. Расейская тэлекампанія НТВ заяўляе, што рэальная лічба забітых у дзесяць разоў большая.

Агенцтва Reuter цытуе міністра замежных справаў Чачні Іліяса Ахмадава, які заявіў журналістам у штабкватэры Арганізацыі Аб'яднаных Нацыяў у Ню Ёрку, што расійская антытэрарыстычная аперацыя ў Чачні хутка дасягнула маштабу паўнацэннай вайны. Паводле словаў Ахмадава, колькасць загіблых перавышае 10 тысячаў чалавек, разбураныя практычна ўсе населеныя пункты Ічкерыі, больш за 200 тысячаў сталі ўцекачамі.

25.01.2000г. Еўрапейскі Звяз пастанавіў пазбавіць Расею розных формаў падтрымкі – 180 мільёнаў эўра – у знак пратэсту супраць брутальнага абыходжання з мірнымі жыхарамі Чачні. 90 мільёнаў эўра, якія мусілі быць скіраваныя ў Расею па лініі TACIC для тэхнічнай дапамогі, цяпер атрымаюць чачэнскія бежанцы.

Бюро Парламенцкай Асамблеі Рады Еўропы не пацвердзіла паўнамоцтваў дэлегацыі Расеі на сесіі ў Страсбургу. Пытанне паўнамоцтваў расейскай дэлегацыі на сесіі Парламенцкай Асамблеі Рады Еўропы перададзенае на разгляд у камісію Парламенцкай Асамблеі. Канчаткова яно будзе вырашана 27 студзеня, падчас "экстраных дэбатаў" на чачэнскую тэматыку.

ПРОГРАММА ТВ — ПЯТНИЦА, 4 ФЕВРАЛЯ

БТ

6.30, 7.00 Доброе утро, Беларусь!
7.00 Новости.
8.15 Политические диалоги.
8.40 Потребительская корзина.
9.00 Новости.
9.10 Музыка. 7-й класс.
9.40 Видеокурс итальянского языка. Передача 2-я.
10.05 «Холода в начале весны», «И еще один радостный день». Короткометражные худ. фильмы.
11.00 Новости.
11.15, 19.50 «Кофе с ароматом женщины». Телесериал.
11.55 Сделано в Беларуси.
12.10 «Сказки Гофмана». Фильм-балет(«Лентелефильм»).
13.00 Новости.
13.15 Мелодрама «Мама Ануш».
14.30 «Сфера».
15.00 Новости.
15.12 Сериал для детей. «Все любят цирк».
15.40 «Судьба моя и надежда».
16.05 Регион.
16.30 «Риск-версия». Телеигра.
17.00 Новости (с/с).
17.15 «А музыка звучит...».
17.35 Наш край. Из истории г.п.Лельчицы Гомельской области.
18.00 Документальный экран. «Пауза».
18.40 Международные спортивные новости.
19.00 Новости.
19.20 «Сегодня с вами...».
20.30 Видеозарисовка.
20.40 Колыбельная.
21.00 Панорама.
21.40 Событие.
22.00 «Виват, маэстро!» Новогоднее теле-шоу. Часть 1-я .
23.25 Криминальная хроника.
23.30 Новости.

ОРТ

08.00, 11.00, 14.00, 17.00, 22.50 Новости.
08.15, 16.00 «Нежный яд». Сериал.
09.15 «Каламбур».
09.45 Процесс.
10.30 Сериал «Новые приключения Синдбада».
13.30 Программа «Вместе».
14.20 Худ.фильм «Приключения на берегах Онтарио».
15.50 «Ералаш».
17.25 Джентльмен-шоу.
18.00 Экстренный вызов. Спасатели.
18.30 Вкусные истории.
18.40 Погода.
18.45 Поле чудес.
19.45 Спокойной ночи, малыши!
20.00 Время.
20.45 Детектив «Восток - дело тонкое».
22.10 «Эх, Семеновна!».
23.05 Боевик «Напарник».

РТР

06.00, 07.00, 08.00, 16.00. 18.00, 20.00, 00.00 Вести.
07.15, 23.45 «Дежурная часть».
07.35 Тысяча и один день.
08.20 Квантовая медицина.
08.30 «Арена - спорт».
09.00 Гомеопатия и здоровье.
09.10 «Цыганка». Сериал.
10.00 «Лето нашей тайны».
15.25 Диалоги о рыбалке.
16.20 Акуна матата.
17.05 Сериал «Жара в Лос-Анджелесе-II».
18.30 «Агата Кристи. Пуаро». «Двадцать четыре черных дрозда».
19.25 «Городок».
20.45 Криминальная драма «Воры в законе».
22.30 «Панорама недели».

НТВ

05.00, 05.30, 05.45, 06.00, 06.30, 06.45, 07.00, 07.30 Сегодня утром.
05.15, 07.15 Спорт, погода.
05.20, 06.15, 17.40 Криминал.
05.35, 07.45 Интересное кино.
05.50, 07.20, 16.25 Впрок.
06.20 Карданный вал.
06.35 Мультфильм.
06.50 Большие деньги.
07.55 Сериал «Агент национальной безопасности».
09.00, 11.00, 13.00, 15.00, 18.00, 21.00 Сегодня.
09.25 Без рецепта.
10.00 Док-шоу «Я и моя собака».
10.30 Служба спасения.
11.30 «Старый телевизор» вспоминает.
13.30 Приключенческий фильм «Сломанная подкова».
15.35 Сериал «Лоис и Кларк. Новые приключения Супермена».
16.40 Интересное кино.
16.50 «Любовь и тайны Сансет Бич».
18.40 Герой дня.
19.00 Сериал «Крутой Уокер: правосудие по-техасски».
20.35 Профессия - репортер. Ольга Надточий. «Требуются женщины...»
21.45 «Криминальная Россия». «Сибирский потрошитель». 1-я серия.
22.15 Комедия «Заводила - король кегельбана».

КУЛЬТУРА

07.05, 11.30, 13.30, 19.30, 23.00 Новости культуры.
07.20, 20.45 После новостей...
07.40, 21.35 «Пивовар». Сериал.
08.40 Формулы музыки.
09.30 «Падение Сайгона». Д/ф.
10.20 «Рыбы, птицы, звери».
10.35, 16.35 «И огонь, и пламя». Сериал.
11.40 «Насреддин в Бухаре». Х/ф.
13.00 «Мой Эрмитаж».
13.45 Мультфильмы.
14.30 «Время музыки».
15.00, 17.30 Новости.
15.10 «Жил - был хомяк». Сериал.
15.35 Времена и воины. «Спартанцы».
16.05 В.Родзянко. «На чужбине». Фильм 2-й.
17.40 Новое кино.
18.05 Новый век российского пианизма.
18.30 «Дама с птицами». Премьера.
19.00 Вечерняя сказка.
19.10 «Приключения Болека и Лелека». Мультсериал.
19.50 «Кто разбудит аксолотля?» Док.фильм.
21.05 Поет Тина Тернер.
22.30 «Кто там...». Авторская программа В. Верника.

Чэхія – краіна з самымі стабільнымі цэнамі

ПА РЭЙТЫНГАХ "GEER"

ЯК ПАСТСАЦЫЯЛІСТЫЧНЫЯ КРАІНЫ БУДУЮЦЬ КАПІТАЛІЗМ

Нядаўна адзін польскі эканаміст чытаў у Варшаве лекцыі групе беларускіх студэнтаў па праблемах пераходнай эканомікі. Пасля лекцый студэнты пачалі задаваць пытанні. Лектар быў вельмі здзіўлены тым, што пачуў: "Іхнія разважанні і зараз застаюцца ў межах планавай сістэмы!".

Дырэктар Гданьскага інстытута рыначнай эканомікі Багдан Вызнікевіч пракаменціраваў гэты факт нават з нейкай разгубленасцю: "Логіка, цалкам забытая ў Польшчы... Нам было цяжка знаходзіць паразуменне...".

Прыклад паказальны. Ён адлюстроўвае вялікую прорву, якая узнікла ў апошнія гады паміж краінамі былога сацыялістычнага лагера. У той час, калі некаторыя дзяржавы ўсё больш грузнуць у паслякамуністычнай дрыгве, іншыя хутка рухаюцца наперад да росквіту і еўрапейскай інтэграцыі. Своеасаблівым чынам пацвярджаюць гэтую выснову і чарговыя апытанні, праведзеныя вядомым часопісам "GEER" — еўрапейскім дадаткам да часопіса "Wall Street Journal Europe's".

Кожны год "GEER" апытвае вядучых эканамістаў свету для ацэнкі эканамічнага развіцця у 27 краінах, якімі цікавіцца часопіс. Кола пытанняў вельмі шырокае — ад этыкі бізнесу да ступені ўдзелу ў сусветнай эканоміцы. Эксперты ставяць адзнаку на дзесяцібальнай шкале, дзе "10" — найвялікшая адзнака, а "0" — ніжэйшая. Потым выводзіцца сярэдняя адзнака па кожнай катэгорыі, і пасля зводу гэтых адзнак разам — сярэдняя адзнака агульнаэканамічнага становішча. Рэйтынг, зразумела, умоўны, але даволі рэальны. Вынікі апытання публікуюцца ў канцы года. Удзельнікаў просяць таксама спрагназаваць у краінах, па якіх ідзе апытанне, валавы ўнутраны прадукт (ВУП) і інфляцыю на наступны год.

Вынікі мінулага года выглядаюць так.

Тры верхнія пазіцыі ў табліцах "GEER", як і ўсе апошнія гады, займаюць Венгрыя, Славенія і Польшча. Пры гэтым, калі раней Венгрыя і Славенія разам дзялілі першая месца, дык у 1999 годзе лідэр вызначыўся дакладна — Венгрыя. У венграў найлепшыя адзнакі па чатырох значных пазіцыях — выкананне законаў, стабільнасць валюты, эфектыўнасць вытворчасці і ліквіднасць. Аднак Славенія працягвае лідзіраваць па такіх паказчыках, як плацежны баланс, інтэграцыя ў сусветную эканоміку, палітычная стабільнасць і эканамічная моц — дасягненні тым больш каштоўныя, што краіна знаходзіцца ў выбухованебяспечным рэгіёне.

Адразу за "тройкай пераможцаў" па большасці паказчыкаў ідуць дзяржавы Балтыі.

Чэшская Рэспубліка крыху ніжэй. Яе галоўнае дасягненне — стабільнасць цэнаў, бо гэтай катэгорыі Чэхія традыцыйна першая. У прыватнасці, эксперты прагназуюць тут у 2000 годзе толькі 4,13% інфляцыі — меншая (каля 4%), на іх думку, будзе толькі ў Латвіі, Летуве і Македоніі.

Нечакана для ўсіх палепшыліся некаторыя паказчыкі Расіі. У выніковым рэйтынгу яна паднялася ажно на 9 пунктаў. Эканамісты лічаць, што станоўчую ролю тут адыграў сумна вядомы крызіс 17 жніўня: міжволі ён вымусіў Расію зрабіць стаўку на ўласныя рэзервы. Танны рубель прывёў да вялікага пад'ёма тамтэйшых вытворцаў, бо экспартныя тавары сталі ў чатыры разы даражэй, чым да крызісу; узрасла вытворчасць працы; адпаведна павысіліся паказчыкі ў катэгорыі "эканамічная моц". Разам з тым увесь гэты рост значны, толькі калі параўноўваць з ранейшым становішчам ў Расіі, аднак мізэрны побач з сусветнымі лічбамі. Пад'ём ВУП у 2000 годзе ў Расіі прагназуюць толькі 1,22% — амаль нябачны вынік пасля разбуральнага дзесяцігадовага спаду. Ацэнка перспектыў таксама вельмі стрыманая. Горкі смак пасля расійскага фінансавага крызісу ўсё яшчэ адчуваюць сусветныя фінансавыя колы — і гэты падыход распаўсюджваецца на ўсе рэспублікі СНГ. "Я лічу, што шок яшчэ не прайшоў, — адзначыў адзін з экспертаў Вернер Варга з "Creditanstalt AG". — Адносіны вельмі асцярожныя для ўсіх гэтых краін".

І наадварот — шмат хто з экспертаў палічыў патрэбным адзначыць, што вынікі крызісу не сталі вельмі цяжкімі для тых пастсацыялістычных краін, якія з самага пачатку рабілі стаўку на заходнія рынкі. Напрыклад, эканомікі Польшчы, Венгрыі і Чэхіі аказаліся дастаткова гнуткімі, каб своечасова "пераарыентаваць свой экспарт ці змяніць структуры вытворчасці" (сп.Вызнікевіч, Гданьскі інстытут). У выніку іх адлегласць ад Расіі рэзка павялічылася. Арыентацыя экспартных шляхоў на Захад у сваю чаргу таксама нараджае праблемы (эканоміка пастсацыялістычных краін зараз больш залежыць ад заходнееўрапейскіх эканамічных працэсаў), але увогуле пераваг тут больш. Між іншым, сп.Варга, аналізуючы агульны стан спраў, адзначыў: "Нямеччына зараз адыгрывае (для ўсходнееўрапейскіх дзяржаў .— **Аўт.**) тую ролю, якую Расія адыгрывала 15 гадоў таму".

Разрыў паміж краінамі бачны яшчэ вось на якіх лічбах. Мы ўжо казалі, што адзнакі ставіліся па дзесяцібальнай шкале — чым больш балаў, тым лепей. Дык вось, калі ў лідэра — Венгрыі — сярэдні паказчык складае 8,53 бала, дык недзе ўнізе знаходзіцца ажно 17 краін з сярднім балам 2,9. Большасць з іх — былыя савецкія рэспублікі (за выключэннем балтыйскіх дзяржаў). Што з гэтага вынікае? "Інвестыцыйная ўвага сканцэнтравана на трох галоўных рынках — Венгрыі, Польшчы і Чэшскай Рэспубліцы" (Соня Гібс, галоўны стратэг для новых еўрапейскіх рынкаў з "Namura International"). Толькі ў Расіі і Казахстане адзначаюцца часовыя інвестыцыйныя ўсплескі.

Характэрная прычына, па якой ў лік аўтсайдэраў трапіла Малдова. Яе сярэдні рэйтынг нечакана для ўсіх упаў на 10 пунктаў. Што здарылася? "Нічога не здарылася, і ў гэтым уся праблема", — адзначае той жа спадар Варга. Краіна, якая з самага пачатку была ў нелепшым становішчы, у дадатак яшчэ і спыніла рух наперад. Галоўны сектар эканомікі -- сельскагаспадарчы -- зараз апынуўся ў вялікай дэпрэсіі. У выніку пад напорам парламенцкіх абвінавачванняў у карупцыі і дрэнным кіраванні эканомікай урад пайшоў у адстаўку — але гэта, у сваю чаргу, дрэнна адбілася на палітычнай стабільнасці.

А вось у суседняй Румыніі эксперты адзначаюць станоўчыя зрухі. "Я думаю, што ўрад там зараз больш рэалістычны," — падкрэсліў Кальман Мішчэй, галоўны чыноўнік па інвестыцыях для Цэнтральнай і Усходняй Еўропы інвестыцыйнай кампаніі "AIG". Ён заўважае, што румынскія ўлады сёння, нягледзячы ні на што, лепш спраўляюцца з праблемамі запазычанасці і прыватызацыі прадпрыемстваў.

Унікальнае становішча ў былой Югаславіі. Зараз краіна, калі глядзець увогуле, адышла ў самы канец выніковага спісу "GEER": сербская эканоміка зруйнавана бомбамі НАТО, і, як лічаць эксперты, яшчэ шмат часу спатрэбіцца, каб яна здолела падняцца. Але побач з Сербіяй знаходзяцца аазісы дабрабыту і спакою: тая ж Славенія. Боснія-Герцагавіна таксама не хутка, але настойліва рухаецца наперад. На думку, экспертаў тут у наступным годзе ВУП узрасце на 8,65% — найбольш аптымістычная ацэнка для рэгіёна. Дарэчы, рост ВУП прагназуецца і для Албаніі.



г. Прага

Зразумела, лічбы росту самі па сабе — паняцце не абсалютнае. У ЗША, згодна з дадзенымі Міжнароднага валютнага фонду, рост ВУП — 3,75, у Босніі — 8,65%, але гэта не значыць, што Боснія хутка будзе жыць, як Амерыка. "Калі ў вас ёсць адна карова, і з'явілася другая, дык прырост ВУП складзе 100%", — усміхаецца сп.Варга. Аднак тут ёсць яшчэ адзін паварот тэмы: па назіраннях экспертаў, чым менш дзяржава, тым прасцей ёй дасягнуць эканамічнага поспеху. "Маленькай краіне прасцей развівацца", — лічыць усё той жа Вернер Варга.

А што ж Беларусь? Стан яе эканомікі таксама аналізаваўся часопісам "GEER". Вынікі несуцяшальныя.

Амаль па ўсіх паказчыках мы знаходзімся на перадапошнім-апошнім месцы. Агульнаэканамічны рэйтынг такі, што горш за яго толькі югаслаўскі (каб разваліць эканоміку сваёй дзяржавы, Мілошавічу спатрэбіліся 10 гадоў і тры вайны. Лукашэнка мірнымі сродкамі дасягнуў таго ж за 5 гадоў). Нават да тых рэчаў, якія наш прэзідэнт лічыць дасягненнямі, эксперты ставяцца скептычна. Рэйтынг палітычнай стабільнасці ў Беларусі, на іх думку, — 3,09, тут мы паміж Арменіяй, дзе спікераў парламента забіваюць літаральна ў зале пасяджэнняў, і Таджыкістанам; рэйтынг выканання законаў — 1,58 (увогуле апошняе месца). Прагнозы на 2000 год кепскія: ВУП — мінусавы (!) паказчык (спад на 1,40%), інфляцыя — 83,11% (самыя высокія лічбы ў спісе).

Нехта скажа, што эксперты памыляюцца (але менавіта ад іх меркаванняў у значнай ступені залежаць замежныя ўкладанні ў нашу эканоміку). Што ж, зразумела, іх меркаванні суб'ектыўныя. Аднак гэтых людзей можна зразумець: вядомыя эканамісты, адказныя за інвестыцыі ў сваіх фірмах, аналізуюць перспектывы ў рэспубліках, якія калісьці будавалі камунізм, а зараз вырашылі жыць інакш. І тут раптам бачаць краіну, якая той камунізм (выбачайце, рынačны сацыялізм) усё будуе, будуе, будуе...

Філіп ШЫШКІН.

ПРОГРАММА ТВ — СУББОТА, 5 ФЕВРАЛЯ

БТ

7.00 Доброе утро, Беларусь!
8.00 «Отражение». Док.фильм.
8.15 Столица.
8.40 Потребительская корзина.
9.00 Новости.
9.10 Детский экран. Мультфильмы.
9.45 Родовод.
10.15 «Сегодня с вами...»
10.40 Здоровье. Тележурнал.
11.05 Вершина мира. Телевикторина.
11.30 Компьютерный полигон.
11.55 «Все нормально, мама!».
12.30 Международные спортивные новости.
12.50 Око. О рекламе и не только...
13.15 Экранизация «Володя большой, Володя маленький».
14.20 Олимп.
15.00 Новости.
15.15 Познай себя.
15.35 «Поем с оркестром». Третий Всебелорусский фестиваль детской эстрадной песни.
16.15 Бон тон. Тележурнал моды.
16.45 Ток-шоу «Это моя работа». Эпидемиолог.
17.15 Земляки. Производственное объединение «Гранит». Передача 2-я.
18.15 «И смех, и беда». Короткометражный худ.фильм.
19.00 Новости.
19.15 Из достоверных источников.
19.35 Бездельник.
20.00 Телебарометр.
20.15 «Кофе с ароматом женщины». Телесериал.
21.00 Панорама.
21.40 «Роза ветров». Новогоднее теле-шоу. Часть 2-я.
22.55 Видимо-невидимо.

ОРТ

07.00, 09.00, 14.00, 17.00 Новости.
07.10 Слово пастыря. Митрополит Кирилл.
07.25 Сериал «Все путешествия команды Кусто».
08.15, 17.10 «Ералаш».
08.30 Играй, гармонь любимая!
09.10 Смак.
09.30 Поле чудес.
10.30 Утренняя почта.
11.00 Комедия «Трактористы».
12.50 В мире животных.
13.30 История одного шедевра.
14.10 Сериал «Горец».
15.05 Мультазбука.
15.40 «В поисках утраченного».
16.20 «Детектив-шоу».
17.30 Угадайка.
18.10 Комедия «Полицейские и воры».
20.00 Авторская программа Сергея Доренко.
21.10 Погода.
21.20 «Китайский городовой».
22.10 «Тысячелетие». Сериал.
23.05 Боевик «Пуля в голову».

РТР

07.00 Мультфильмы.
07.30 Папа, мама, я - спортивная семья.
08.25, 00.45 Прогноз погоды.
08.30 Почта РТР.
09.00 Доброе утро, страна.
09.35 «Сто к одному».
10.25 Сам себе режиссер.
10.55 «Друзья». Сериал.
11.25 Эх, дороги...
11.40 «Золотой ключ».
12.00, 20.00 Вести.
12.20 Федерация.
13.00 Худ.фильм «Путь к причалу».
14.35 «Том и Джерри».
15.05 Телеспецназ.
16.05 «На здоровье!».
17.00 Моя семья.
18.00 «Два рояля».
18.55 «Аншлаг» и К.
20.45 Триллер «Цвет ночи».
23.05 Авангардистский фильм «Тело капитана будет предано земле, а старший мичман будет петь».

НТВ

07.00, 09.00, 11.00, 15.00, 18.00, 21.00 Сегодня.
07.15 Сериал «Крутой Уокер: правосудие по-техасски».
08.00 «Закон джунглей».
08.30 «Миго-инопланетянин».
09.15 Криминал. «Чистосердечное признание».
09.45 Телеигра «О, счастливчик!»
10.25 Без рецепта.
11.25 Большие деньги.
11.55 Комедия «Штрафной удар».
13.30 «В нашу гавань заходили корабли».
14.25 «Круглая дата». Полад Бюль-Бюль оглы.
15.25 «Любовные истории, которые потрясли мир».
15.55 «Она написала убийство».
16.50 Дог-шоу «Я и моя собака».
17.25 Герой дня без галстука.
18.30 Боевик «Джеймс Бонд - агент 007». «Операция «Шаровая молния».
21.45 Сериал «Ее звали Никита».
23.25 Ток-шоу «Про это».
00.05 Худ.фильм «Реаниматор».

КУЛЬТУРА

09.05 «Читая Библию».
09.15 «Аистенок».
09.40 «Сорванец». Худ.фильм.
11.05 «Чебурашка». Мультфильм.
11.25 «Гражданская война в Америке». Док.сериал.
12.35 Графоман.
13.00 «Неизвестная роль... Евгения Евстигнеева».
13.30, 21.00 Новости культуры.
13.45 «Сыновья и любовники».
14.40 «Мой цирк».
15.05 «Боткины».
15.30 Музыка барокко в Патриарших палатах Московского Кремля.
16.00 «Рюрик и его Шелтозеро». Д/ф.
16.30, 17.35 «Мартин Иден». Телеспектакль.
17.30 Новости.
18.40 «Царская ложа».
19.20 Вечерняя сказка.
19.30 «Приключения Болека и Лелека». Мультсериал.
19.40 «Исповедь художника. Михаил Шемякин». Док.фильм.
20.30 Никитинские вечера.
21.20 Блеф-клуб.
22.00 «Контакты и конфликты». М/ф.
22.15 «Любовная история». Х/ф.

МОЙ ВЫХАДНЫ

Беларускі каляндар: 24 студзеня



У XVIII ст. неабходнай часткай мужчынскага касцюма заможных слаёў насельніцтва Рэчы Паспалітай былі шырокія, па-мастацку аздобленыя шаўковыя паясы. Іх павязвалі паверх кунтуша – старажытнага адзення ў выглядзе доўгага кафтана з шырокімі рукавамі.

Спачатку каштоўныя шаўковыя паясы завозіліся на Беларусь і Украіну з розных краін Усходу. Улічваючы папулярнасць паясоў, паступова наладжвалася іх прамысловая вытворчасць.

Сусветна вядомыя паясы вырабляліся з 1750-х гг. на Слуцкай мануфактуры шаўковых паясоў, заснаванай князем Міхаілам Казімірам Радзівілам. У 1758 г. фабрыку ўзначаліў таленавіты майстар з Канстанцінопаля Ян Маджарскі. 24 студзеня таго ж года Маджарскі падпісаў з Радзівілам дамову, па якой абавязаўся ткаць паясы, кілімы, дываны, а таксама навучаць майстроў.

Звычайна, калі гаворка заходзіць пра слуцкія паясы, узгадваецца верш Максіма Багдановіча "Слуцкія ткачыхі". Але трэба адзначыць, што паэт, які так натхнёна апісаў паднявольную працу нашых таленавітых жанчын, пакінуў нам... гістарычна памылковы вобраз. На самай справе, паводле дакументальных звестак, сярод работнікаў фабрыкі не было ніводнай жанчыны.

Спачатку на фабрыцы працавалі персы і туркі, запрошаныя ў Слуцк князем. Але літаральна праз 10—15 гадоў слуцкая фабрыка пачынае абслугоўвацца мясцовымі майстрамі. Імёны некаторых з іх вядомыя. Гэта – Іосіф Барсук, Міхаіл Баранцэвіч, Канчыла, Лойка.

Выраб слуцкіх паясоў быў вельмі працаёмкім. За год вопытны майстар звычайна выробляў не больш як восем паясоў. На тое былі прычыны: некаторыя з паясоў дасягалі больш за 3 метры ў даўжыню і мелі шырыню 40 сантыметраў. Да таго ж адзін выраб вельмі рэдка паўтараў другі – кожны быў арыгінальным экземплярам.

Справу Яна Маджарскага атрымаў у спадчыну яго сын Лявон, які з 1777 па 1807 год арандаваў мануфактуру і зрабіў яе буйным прадпрыемствам. У 1793 г. тут працавалі 60 ткачоў, мелася 28 станкоў. На фабрыцы выраблялася да 200 паясоў у год, у яе асартыменце да таго ж былі шаўковыя пакрывалы, махры, залатыя і сярэбраныя галуны, падвязкі, стужкі, габелены, дываны, спецыяльныя тканіны для літургічнага ўжытку.

Часта ў арнаментальны дэкор слуцкіх паясоў уключаліся матывы мясцовай флоры – валошкі, незабудкі, рамонкі і інш. Паводле беларускай нацыянальнай традыцыі, канцы паясоў былі аздоблены прышыўнымі махрамі, якія рабіліся з шаўковых ці сярэбраных нітак. Улюбёнымі спалучэннямі ў расфарбоўцы слуцкіх паясоў былі аранжавы з сінім і залатым, пунсовым з сінім і залатым і інш.

Асаблівай дэкаратыўнасцю вызначаліся так званыя літыя паясы. У іх добры бок быў так густа затканы залатой ніткай, што яго шаўковая аснова амаль не праглядвалася. Пояс пракатвалі цяжкімі каталкамі, ад чаго металічныя ніткі расплюшчваліся і зліваліся. Пры гэтым стваралася ўражанне, што пояс не тканы, а адліты з золата ці срэбра.

Слуцкая фабрыка працавала да 1844г., але ў апошнія гады замест паясоў на ёй пачынаюць выпускаць узорыстыя і залатныя тканіны для патрэбаў царквы. Гэта адбылося таму, што пасля анексіі Беларусі Расіяй было забаронена насіць кунтушы.

Слуцкія паясы – цудоўныя ўзоры беларускага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, сапраўдныя шэдэўры шоўкаткацтва. Беларускія ткачы, якія прыйшлі ў гэту вытворчасць, прынеслі з сабой не толькі майстэрства, але і вытанчаны густ нашага народа. На доўгія дзесяцігоддзі слуцкія паясы сталі своеасаблівым сімвалам Беларусі.

Шкада, але ні ў Мінску, ні ў Слуцку да гэтага часу няма музеяў слуцкіх паясоў. Ды, шчыра кажучы, і рабіць экспазіцыі няма з чаго, бо на Беларусі слуцкіх паясоў захавалася ўсяго пяцьшэсць, у той час як у адным Плоцка-Мазавецкім музеі ў Польшчы іх маецца каля 300!

Як апраўдаемся перад нашчадкамі за страчаны скарб, слава аб якім ішла па ўсім свеце?..

Андрэй БЕЛАРЭЦКІ.

На здымку: *пояс. Слуцкая мануфактура. 1778--1807 гг.*

ГАЗЕТА СТАНЕТ ЕЩЕ ИНТЕРЕСНЕЕ, ЕСЛИ ВЫ НАМ ПОМОЖЕТЕ!

Дорогие читатели!

Давайте познакомимся. Вы только что прочли очередной номер "Рабочага" (а кто-то, наверное, читает нас постоянно), так что более-менее представляете, чем мы дышим и как думаем. Но и редакции хотелось бы получше узнать своего читателя — того, для кого мы работаем. Это нужно для того, чтобы газета стала для вас близким другом, интересным и полезным собеседником. Тогда нам легче будет подбирать темы своих статей, находить героев, открывать новые рубрики.

Перед вами — наша анкета. Имя свое указывать необязательно, можете опустить и вопросы, которые вам по каким-то причинам не нравятся. Но в любом случае мы будем рады получить от вас весточку.

КАК ДАВНО ВЫ СТАЛИ НАШИМ ЧИТАТЕЛЕМ?

1. Читаю постоянно.
2. Читаю от случая к случаю.
3. Этот номер — первый, который я увидел.
4. Я выписываю "Рабочы".
5. Я купил его в киоске.

КТО ВЫ ПО ПРОФЕССИИ?

1. Рабочий.
2. ИТР.
3. ________

РАБОТАЕТЕ ЛИ ПО СПЕЦИАЛЬНОСТИ СЕЙЧАС?

ВАШ ВОЗРАСТ?

ЧЕМ ВЫ ЗАНИМАЕТЕСЬ В СВОБОДНОЕ ВРЕМЯ?

ВАШ ЗАРАБОТОК?

1. На жизнь не хватает.
2. Еле-еле хватает.
3. Заработком доволен.

КАКИЕ ТЕМЫ ВАС ИНТЕРЕСУЮТ БОЛЬШЕ ВСЕГО?

1. Политика.
2. Экономика.
3. Международная жизнь.
4. Экология и здоровье.
5. Семейный бюджет.
6. Юридическая консультация.

БЛАГОДАРИМ ЗА ПОМОЩЬ!

СЛУХАЙ СВАЁ! ПАТРАБУЙ БЕЛАРУСКАЕ!

Падтрымаўшы ініцыятыву "НАШАЙ НІВЫ" «ДЗЕНЬ БЕЗ ЧУЖОГА СЛОВА», Беларуская музычная альтэрнатыва прапануе адмовіцца таксама і ад чужой музыкі. Праводзім акцыю ***«СЛУХАЙ СВАЁ! ПАТРАБУЙ БЕЛАРУСКАЕ!»***. Асаблівая ўвага ў гэтай акцыі надаецца FM-станцыям. Усім сьвядомым беларусам прапануецца тэлефанаваць на радыё, віншаваць сяброў з нацыянальнымі сьвятамі і замаўляць беларускія песьні.

FM-станцыі не супраць пускаць у эфір беларускія кампазыцыі, але якасьць аўдыякасэтаў (большасьць беларускай музыкі выдаецца менавіта на іх) не адпавядае стандартам. Таму БМА разаслала ўсім беларускім і некаторым замежным радыёстанцыям кампакт-дыск «ВОЛЬНЫЯ ТАНЦЫ: СЛУХАЙ СВАЁ!» выдадзены сумесна з Беларускім Хельсінкскім Камітэтам, на якім ёсьць запісы практычна ўсіх беларускіх гуртоў. Таксама на радыёстанцыях пачалі зьяўляцца і іншыя кампакты айчынных гуртоў: "Крамы", "Тройцы", "Крыві", "Уліса", "Палаца", "Новага неба", "Бонды", "N.R.M" ...

Будзем спадзявацца, што з нашай і Вашай дапамогай сітуацыя зьменіцца. Зацікаўленым у супрацоўніцтве з БМА можна зьвяртацца: 220085, Менск, а/с 5.

Радыёстанцыя	Форма заяўкі	Час выкананьня заяўкі
«Рокс»	ліст: 220002, Менск, Старажоўская, 8-а; факс: (017) 2134013 пэйджар: 2110000 (аб. «Радыё Рокс»)	Мінім'юзікбокс: на працягу дня; максім'юзікбокс: нядзеля з 19 да 21; пазначайце час і дату выкананьня заяўкі
Радыё «Бі-Эй»	ліст:220034, Менск, Чапаева, 5; тэл. (017)2100901 з 22: 00	на працягу дня
«Маладзёвае радыё», 1-я праграма Беларускага радыё	ліст: 220807, Менск, Чырвоная, 4 («Маладзёвае радыё»); тэл. прамога эфіру (017) 2846935 (па пятніцах з 22:00)	пятніца з 22:40
«Мір»	ліст: 220807, Менск, Камуністычная, 6; тэл. (017) 2366777	нядзеля -- «Вагон пажаданьняў»; на працягу дня, прамы эфір
"Альфа-радыё"	Ліст: 220125, Менск, пр. Скарыны, 181; Факс: (017) 2837896 з 10:45 да 11:15	будныя дні з 12:00 да 14:00
2-я праграма Беларускага радыё	Ліст: 220807, Менск, Чырвоная, 4; Тэл.прамога эфіру: (017) 2101248	штодзень з 12:00
«Сталіца»	ліст: 220034, Менск, Захарава, 42 (Канавалава); тэл. (0172) 2100367	штодзень з 13:00 да 14:00

ПРОГРАММА ТВ — ВОСКРЕСЕНЬЕ, 6 ФЕВРАЛЯ

БТ

7.00 Доброе утро, Беларусь!
8.00 Мультсериал для детей «Приключение в королевстве».
8.26 Телебарометр.
8.40 Потребительская корзина.
9.00 Новости.
9.10 Мультиклуб.
9.25 «Вас вызывает Спортландия».
10.15 Туробъектив.
10.40 «Все нормально, мама!»
11.10 Арсенал.
11.35 Марсово поле.
11.50 АРТ-клуб.
12.25 Международные спортивные новости.
12.45 Сделано в Беларуси.
13.05 Телевизионный Дом кино. Лучшие актеры 1999 года.
13.45 Личности XX века. Док.сериал «Сокровенные люди»(Россия). 4-я серия.
14.00 Сельчане.
14.25 «Золотые ключи».
15.00 Новости.
15.15 «На волне взаимопонимания».
16.00 Мультфильмы.
16.25 Х/ф Н.Михалкова «Неоконченная пьеса для механического пианино».
18.05 «Зорная ростань».
18.35 Теленавигатор.
19.00 «Кофе с ароматом женщины». Телесериал.
19.45 Премьера песни.
20.00 Резонанс.
20.45 Стадион.
21.05 Ток-шоу «Карамболь» с участием Виталия Вульфа.
21.40 Х/ф «Грех лицедейства».
0.05 Авто-парк.
0.15 Акколада.

ОРТ

07.00, 09.00, 14.00 Новости.
07.10 Армейский магазин.
07.40 «Гуфи и его команда».
08.10 Утренняя звезда.
09.10 «Непутевые заметки».
09.30 Пока все дома.
10.00 Комедия «Альф».
10.30 Здоровье.
11.00 «Знатоки» возвращаются. Дело N 6. «Шантаж».
14.10 Сериал «Горец».
14.55 Умницы и умники.
15.25 «101 далматинец».
15.50 «Новые приключения Винни-Пуха».
16.15 Как это было.
16.55 «Женские истории».
17.25 Смехопанорама.
18.00 «Невзоров».
18.55 Суперфильм «Привидение».
21.10 Информационная программа с П.Шереметом.
22.05 Погода.
22.10 Худ.фильм «Бешеный бык».

РТР

07.00 Служу Отечеству.
07.25, 01.15 Прогноз погоды.
07.30, 11.40 Мультфильмы.
08.20 «Устами младенца».
08.50 Доброе утро, страна.
09.30 «Аншлаг» и К.
10.30 «Ретро-городок».
11.00 Русское лото.
12.00 Вести.
12.20 Парламентский час.
13.00 Старая квартира.
14.05 Диалоги о животных.
15.05 «Закон и порядок». Сериал.
16.05 «Привести в исполнение». Док.фильм.
17.00 Перед «Зеркалом».
17.15 Комедия «Прохиндиада-2».
19.00 Зеркало.
20.00 Худ.фильм «Соломон». 1-я с.
21.40 «Площадь звезд».
23.20 Худ.фильм «Розенкранц и Гильдестерн мертвы».

НТВ

07.00, 09.00, 11.00, 15.00 Сегодня.
07.15 Сериал «Ее звали Никита».
08.00 «Закон джунглей».
08.30 «Миго-инопланетянин».
09.15 Служба спасения.
09.40 Пойми меня.
10.10 Путешествия натуралиста.
10.40 Профессия - репортер. Ольга Надточий «Требуются женщины...».
11.25 «Полундра». Семейная игра.
11.55 «Женский взгляд» Оксаны Пушкиной.
12.25 «Ключи от форта Байяр».
14.15"Криминальная Россия».
14.45 Фитиль.
15.35 Большие родители.
16.05 Док.сериал «Холодная война».
16.55 «Она написала убийство».
18.00 Итоги.
19.35 Куклы.
19.50 Сериал «Улицы разбитых фонарей-II».
20.50 «Итого».
21.10 Комедия «Полицейская академия-4».
22.50 «Третий тайм».

КУЛЬТУРА

09.05 «Читая Библию».
09.15 «Аистенок».
09.40 «Подмененная королева». Худ.фильм.
10.45 Мировая деревня.
11.40 «Консилиум».
12.05 Экспедиция «Чиж».
12.35 А.П.Чехов. «О любви».
13.00 Полонезы Г. Венявского исполняет М. Федотов.
13.15 Дворцовые тайны.
13.30, 21.00 Новости культуры.
13.45 «Маугли». Мультфильм.
14.55 Кинопанорама. Встречи.
15.20 «Боткины». Часть 2-я.
15.45 Положение вещей.
16.20 «Мартин Иден». Телеспектакль.
17.30 Новости.
17.35«Во имя жизни и любви». Д/ф.
18.25 Романс... с Любовью Казарновской.
18.50 Вечерняя сказка.
19.00 «Приключения Болека и Лелека». Мультсериал.
19.10 «С потолка».
19.35 «Лондонская фестивальная труппа».
20.45 Мультсериал для взрослых «Детективный дуэт. Иван и Митрофан».
21.20 «Музыкальные истории».
21.45 «Бульвар революции». Худ.фильм.

РАБОЧЫ
ШТОТЫДНЁВАЯ МАСАВА-ПАЛІТЫЧНАЯ ГАЗЕТА

Заснавальнік і галоўны рэдактар **Віктар ІВАШКЕВІЧ**

*Пасведчанне аб рэгістрацыі № 1255 ад 27.12.99г. Наклад *000. Нумар падпісаны ў друк 25.01.2000 г. у 19.00. Заказ 56*
Надрукавана ў друкарні ПП "Мэджык" (г.Мінск, вул.В.Харужай. 13/61)

Адрас рэдакцыі:
220030, г.Мінск, пл.Свабоды,23, «РАБОЧЫ»
E-mail: kapp@irex.minsk.by
Тэл. (017)227-04-54
Тэл./факс (017)227-13-16